Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
11 СНЕЖНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 240 (28098) Кошт 2000 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Шакаладныя рэкі ад «Камунаркі»**
СТАР. 3



**Манетны двор у Брэсцкай крэпасці?**
СТАР. 16



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**
**20 КАНАЛАЎ**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**100,5 працэнта**

*склаў індэкс спажывецкіх цэн у краіне на тавары і паслугі ў лістападзе ў параўнанні з кастрычнікам 2015 года, а са снежнем 2014-га — 110,7 працэнта, пра што паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт. Харчовыя тавары ў лістападзе падаражэлі на 0,7 працэнта ў параўнанні з кастрычнікам 2015 года і на 9,3 працэнта ў параўнанні са снежнем 2014-га. Цэны на нехарчовыя тавары выраслі на 0,5 працэнта і 11,5 працэнта адпаведна. Індэкс цэн і тарыфаў на платныя паслугі ў лістападзе склаў 99,97 працэнта ў параўнанні з кастрычнікам і 112,4 працэнта — са снежнем 2014 года.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.12.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18248,00 | ▼ |
| Еўра | 20056,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 263,56 | ▼ |
| Укр. грыўня | 774,86 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# У АДНЫМ НАПРАМКУ

## Беларусь і Туркменістан поўныя рашучасці нарасціць аб'ёмы тавараабароту

**Гэта пацвердзілі прэзідэнты дзвюх краін Аляксандр Лукашэнка і Гурбангулы Бердымухамедаў на сустрэчы сам-насам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

Кіраўнік беларускай дзяржавы звярнуў увагу на пэўныя праблемы са зніжэннем узаемнага тавараабароту. Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў неабходнасць яго нарошчвання, паколькі гэта з'яўляецца фундаментам двухбаковых адносін. «І мы поўныя рашучасці аднавіць гэтыя гандлёва-эканамічныя адносіны», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі і Туркменістана ёсць дамоўленасці ў машынабудаванні, і прапанаваў працаваць сумесна на рынках суседніх краін. «Мы нямала зрабілі, каб тут быў рэальны сектар, падобны да беларускага», — адзначыў беларускі лідар. Ён дадаў, што Беларусь гатова супрацоўнічаць з Туркменістанам па шырокім спектры напрамкаў, пачынаючы ад ваенна-прамысловага комплексу і да падрыхтоўкі кадраў.

У гэтыя дні ў Ашхабадзе праходзіць беларуска-туркменская выстаўка-кірмаш. На думку беларускага лідара, тут ёсць магчымасць прадэманстраваць не толькі народу Туркменістана, але і гасцям мерапрыемства, што могуць вырабляць абедзве краіны. Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем заўважыў, што яго візіт у Туркменістан праходзіць напярэдадні вялікай падзеі, якая прадвызначыла напрамак палітыкі краіны, — Дня нейтралітэту. Ён адзначыў, што тэмай, якая абмяркоўваецца ўдзельнікамі міжнароднай канферэнцыі, што пройдзе з нагоды свята ў Ашхабадзе 12 снежня, стане міжнароднае супрацоўніцтва ў імя міру, бяспекі і развіцця. «Без міру і бяспекі няма стабільнасці. Гэта якраз на злобу дня. Вакол бушуюць пажары канфліктаў, сутыкненняў і ўжо войнаў. Не дай бог, як я ўжо гаварыў, выступаючы ў ААН, нам дажыць да таго часу, калі гэта перарасце ў маштабную вайну. Гэта вельмі важны кантэкст размовы», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы.

СТАР. 2

■ Надвор'е

## НА ВЫХАДНЫЯ МОКРЫ СНЕГ З ДАЖДЖОМ



**У найбліжэйшыя дні на тэрыторыі Беларусі чакаецца няўстойлівае надвор'е з невялікімі ападкамі. Аб гэтым паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень будзе яшчэ даволі спакойна, калі надвор'е будзе абумоўліваць зона павышанага атмасфернага ціску, але па паўночным захадзе адаб'ецца ўплыў франтальнага раздзелу. Чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень месцамі па паўночным захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы і часам мокры снег. Раніцай у некаторых раёнах магчымы туман, слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Па поўначы месцамі ўзмоцніцца паўднёва-заходні вецер парывамі да 15-17 м/с. Максімальная тэмпература паветра складзе ад нуля да 6 цяпла.

Спецыялісты ўпэўнены, што ў выхадныя надвор'е ў Беларусі будуць вызначаць атмасферныя франты, якія перамяшчаюцца з боку Заходняй Еўропы. У суботу месцамі прагназуецца мокры снег і дождж. У асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, уначы і раніцай на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, а ўдзень чакаецца ад 1 марозу да 5 цяпла. Чакаюцца невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу і ў нядзелю.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак уначы захаваецца ўплыў атмасферных франтоў, аднак ужо ўдзень на тэрыторыю краіны пачнуць паступаць няўстойлівыя паветраныя масы, якія рухаюцца да нас з боку Балтыйскага мора. Таму ўначы на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовы дождж і мокры снег. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. А яшчэ сіноптыкі падлічылі, што вельмі цёпла было ў панядзелак, 7 снежня, калі максімальная тэмпература дасягала плюс 7-12 градусаў. Эксперты ад Белгідраметцэнтра не выключаюць, што гэты дзень можа ўвайсці ў гісторыю зімы як адзін з самых цёплых дзён сезона.

**Сяргей КУРКАЧ.** kurkach@zviazda.by

■ Будзе свята!

## ЦЭНАМ ЗАГАДАНА СТАЯЦЬ НА МЕСЦЫ

**Міністэрства гандлю ўвяло мараторый на рост цэн у навагодні перыяд.**

Галіновым міністэрствам, канцэрнам, абласным і Мінскаму гарадскому выканкамам прадпісана абвясціць яго на павелічэнне адпускных і розничных цэн на спажывецкія тавары ў перадсвяточныя і святочныя дні. За незахаванне парадку цэнаўтварэння, а таксама заканадаўства аб гандлі (рэалізацыя пратэрмінаваных ці няякасных тавараў, незахаванне рэжыму работы аб'екта, асартыментнага пераліку, падман пакупнікоў і г.д.) да парушальнікаў будуць прымяняцца адпаведныя меры.

Напярэдадні навагодніх свят прадпрыемствы галіны правядуць больш за тысячу кірмашоў і звыш чатырох тысяч выставак-продажаў, дэгустацый, распродажаў тавараў. На іх будуць прадастаўлены зніжкі ад 10 да 70 працэнтаў. Апошняя ўстанаўліваецца ад рознічнай цаны, а не ад гандлёвай надбаўкі, каб пакупнікі маглі атрымаць дакладную інфармацыю пра зніжкі. Прадавец можа афарміць цэннік, закрэсліўшы старую цану і выставіўшы новую і ўказаўшы працэнт або суму, якую эканоміць спажывец.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал 2016 года!
Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# У АДНЫМ НАПРАМКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«З задавальненнем адзначу і агульнасць нашых падыходаў да пабудовы дзяржавы. Паводле ўзаемнага меркавання, яна павінна быць сацыяльна арыентаваная. Яе важнейшым прынцыпам з'яўляецца якасць жыцця людзей», — падкрэсліў беларускі лідар. Прэзідэнт Туркменістана назваў візіт свайго калегі знакавым і гістарычным, паколькі ён праходзіць у святочныя для краіны дні. Ён адзначыў, што Беларусь і Туркменістан з'яўляюцца аднадумцамі на міжнароднай арэне. Гаворачы аб эканамічным складніку двухбаковых адносін, Гурбангулы Бердымухамедаў высока ацаніў развіццё беларускай прамысловасці, адзначыўшы, што гэта прадукцыя запатрабавана ў Туркменістане, а Беларусь славіцца ў свеце як тэхналагічная краіна.

Туркменскі лідар звярнуў увагу і на гуманітарную сферу супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі, падкрэсліўшы яе важнасць для развіцця адносін паміж народамі. Гурбангулы Бердымухамедаў падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за падрыхтоўку туркменскіх грамадзян у беларускіх навучальных установах. «У вас навучаецца больш як 9 тыс. туркменскай моладзі. Беларусь — гэта кузня кадраў», — сказаў ён.

Прэзідэнт Туркменістана згадаў таксама буйнамаштабны праект, які рэалізуецца бакамі, — будаўніцтва Гарлыкскага горна-абагачальнага камбіната. Ён падкрэсліў, што яго прадукцыя запатрабавана не толькі ў рэгіёне, але і ва ўсім свеце, і выказаў надзею, што гэты аб'ект будзе здадзены ў тэрмін. Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым заўважыў, што асноўныя цяжкасці ўжо ў мінулым. Туркменскі лідар выказаў удзячнасць беларускаму боку за рэалізацыю гэтага праекта ў Туркменістане.

Беларусь і Туркменістан падпісалі дарожную карту супрацоўніцтва на 2016-2017 гады. Падпісанне дакумента адбылося ўчора ў прысутнасці прэзідэнтаў дзвюх краін Аляксандра Лукашэнкі і Гурбангулы Бердымухамедава па выніках іх перагавораў. Дарожная карта ўяўляе сабой план сумесных мерапрыемстваў па развіцці супрацоўніцтва дзвюх краін. Лідары дзвюх дзяржаў прынялі сумесную заяву аб паглыбленні адносін дружбы і супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Туркменістанам.

■ Май на ўвазе!

## У Новы год будзем з шампанскім і цукеркамі

**У крамах з'явіліся новыя спецыялізаваныя секцыі па продажы асартыменту навагодняй тэматыкі. Адных толькі штучных елак у гандлёвай сетцы Мінска налічваецца каля 100 разнавіднасцей!**

Кошты на сінтэтычных вечназялёных прыгажунь вагаюцца ад 60 тысяч рублёў да 5 млн — у залежнасці ад вышыні. Жывыя ж елкі на елачных базарах (іх у Мінску будзе каля 200) пачнуць прадаваць з 22 снежня, кошты на іх складуць ад 70 тысяч да 220 тысяч рублёў. Як паведаміў **першы намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Аляксей РАМАНАЎ,** у гандлёвых пунктах запланаваны разнастайныя святочныя акцыі, распродажы і падарункі, праца Дзядоў Маразоў і Снягурак. Харчовыя крамы плануюць атрымаць больш за 2,5 млн бутэлек шампанскага, 10 тысяч тон кандытарскіх вырабаў і больш як 620 тысяч падарункавых набораў цукерак розных памераў і напаўнення (коштам ад 45 да 400 тысяч рублёў).

Павялічаны рэжым працы аб'ектаў гандлю. З 15 снежня 2015 года да 7 студзеня 2016-га для харчовых крам гандлёвай плошчай звыш 650 кв. м заканчэнне працы ўстаноўлена не раней за 22.00. А 25, 31 снежня і 7 студзеня крамы будуць працаваць па рэжыме рабочага дня.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*

**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» вносит изменения в извещение о проведении повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 50% после очередных несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости – зданий, принадлежащих Открытому акционерному обществу «Ратон» на праве собственности, назначенного на 14.12.2015 г.**

Внести в текст извещения следующие изменения: дата и время проведения аукциона – **22 декабря 2015 г., 11.00.**

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Артема, 23 по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 по **21 декабря 2015 г.** включительно. Заключительная регистрация с 09.00 до 11.00 **22 декабря 2015 г.**

*Первоначальное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 03.12.2015 г. №234.*

Дополнительная информация по тел. (0232) 70-46-47. УНП 490318588

■ Парламенцкі дзённік

# РЭАКЦЫЯ НА АПЯРЭДЖАННЕ

**Учора ў Палаце прадстаўнікоў былі разгледжаны дакументы, якія закліканы своечасова зняць напружанне ў сацыяльнай сферы нашай краіны, стварыць дадатковыя ўмовы для развіцця эканомікі і павысіць абараназдольнасць Беларусі.**

## ДЗЕЛЯ ГРОШАЙ

— Зараз мы, як ніколі, зацікаўлены ў прамых замежных інвестыцыях, доўгатэрміновым вядзенні бізнесу ў Беларусі, у рэінвеставанні (паўторным укладанні капіталу ў эканоміку. — **Рэд.**) атрыманай прыбылі, выкарыстанні сучасных тэхналогій вытворчасці і менеджменту, — заявіў учора ў Авальнай зале Палаты прадстаўнікоў **Уладзіслаў ШЧЭПАЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы.** — Патэнцыйны інвестар часта стаіць перад выбарам: дзе пачынаць свой бізнес — у Беларусі, Расійскай Федэрацыі або Казахстане. У Беларусі для максімальнага выкарыстання канкурэнтных пераваг (эканоміка-геаграфічнае становішча, палітычная стабільнасць і бяспека) устаноўлены прававыя гарантыі для інвестыцый, спрыяльны рэжым дзейнасці, і льготы і прэферэнцыі для інвестараў.

Яшчэ адным дакументам, які створыць дадатковыя прывабныя ўмовы для інвестыцый у прыярытэтных сектарах эканомікі, закліка765ны стаць Дэкрэт Прэзідэнта №8 (ад 12 лістапада 2015 года).

Гэты дакумент выкладае ў новай рэдакцыі Дэкрэт Прэзідэнта №10 «Аб стварэнні дадатковых умоў для інвестыцыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь». Ён прадугледжвае зняцце забароны на здзяйсненне здзелак з аб'ектамі будаўніцтва да іх уводу ў эксплуатацыю, індывідуальны падыход у выпадку спынення інвестыцыйнай дзейнасці (магчыма вызваленне інвестара ад кампенсацыі дадзеных яму льгот, прэферэнцый і ад выплаты штрафаў і няўстоек або іх растэрміноўка).

У выпадку невыканання інвестарам сваіх абавязацельстваў і адабрання ў яго зямельнага ўчастка з незавершаным будаўніцтвам дэкрэт прадугледжвае продаж гэтых аб'ектаў праз таргі або аўкцыён і вяртанне інвестару панесеных выдаткаў з улікам выдаткаў дзяржавы.

Асноўныя палажэнні дэкрэта ўступяць у сілу ў маі 2015 года.

## ДЗЕЛЯ ІНФРАСТРУКТУРЫ

Яшчэ адным стымулам для прыцягнення інвестыцый павінен стаць законапраект аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве, які быў разгледжаны ў другім чытанні.

— Прыняцце законапраекта — гэта новая старонка ў інвестыцыйнай дзейнасці нашай краіны, — лічыць **Віктар Валюшыцкі, старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы.**

Паводле яго слоў, праекты дзяржаўна-прыватнага партнёрства выгадны дзяржаве з пункту гледжання вырашэння пытанняў будаўніцтва інфраструктурных аб'ектаў. «У перыяд вострага дэфіцыту сродкаў бюджэту мы хочам прыцягнуць сродкі бізнесу для рэалізацыі інфраструктурных праектаў. Бізнес, рэалізуючы кожны з праектаў, можа на гэтым зарабіць. Гэта значыць, узаемавыгаднае партнёрства — выгада і для дзяржавы, і для прыватнага партнёра», — рэзюмаваў дэпутат.

## ДЗЕЛЯ АБАРОНЫ

Палата прадстаўнікоў адразу ў двух чытаннях разгледзела змяненні ў закон «Аб дзяржаўнай праграме ўзбраення і дзяржаўным абаронным заказе».

— Вопыт рэалізацыі праграмы, якая сфарміравана на 10 гадоў наперад, паказаў неабходнасць унясення ў яе змен у самыя кароткія тэрміны, — далажыў парламентарыям **першы намеснік старшыні Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Беларусі Ігар БЫКАЎ.** — Дзяржпраграма ўяўляе з сябе сукупнасць тысяч мерапрыемстваў, і сфарміраваць яе так, каб яна магла быць дакладна выканана, немагчыма. Гэта прыводзіць да штогадовых карэкціровак праз указы кіраўніка дзяржавы.

У 2012 годзе парламентам Беларусі ўжо быў зроблены крок у бок больш мабільнай праграмы ўзбраення — не на 10 гадоў наперад, а на 5. Новы законапраект дазволіць зрабіць сам механізм яе змянення больш гнуткім і аптымальным — праз штогадовыя дзяржаўныя абаронныя заказы. Акрамя таго, законапраект дазваляе пераносіць незавершаныя з аб'ектыўных прычын мерапрыемствы на наступны год.

## ДЗЕЛЯ БЯСПЕКІ

У другім чытанні быў прыняты і законапраект аб прамысловай бяспецы. Новы закон будзе прадугледжваць унясенне ўсіх небяспечных вытворчых аб'ектаў яшчэ да іх уводу ў эксплуатацыю ў спецыяльны дзяржаўны рэестр, адкуль яны будуць выключацца толькі пасля вываду з эксплуатацыі. Іншымі словамі, прадпрыемствы не змогуць выйсці з-пад кантролю, нават калі зменяць уласніка.

Дакумент прадугледжвае, што ў дзяржрэестры небяспечных вытворчых аб'ектаў будуць весці свае раздзелы і сілавыя ведамствы. Больш дакладна прапісаны падыходы да падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне прамысловай бяспекі і праверкі ведаў тых, хто эксплуатуе патэнцыяльна небяспечныя аб'екты.

## ДЗЕЛЯ ЗАНЯТАСЦІ

Законапраект аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у закон «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» быў прыняты дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў у першым чытанні.

Уведзена норма, згодна з якой працадаўца, калі яго работнік аказваецца пад пагрозай звальнення, павінен паправядзіць аб гэтым органы па працы і занятасці за два месяцы.

Работнікамі, якія знаходзяцца пад пагрозай звальнення, зараз прызнаюцца лічыць не толькі тых, хто падпадае пад скарачэнне кадраў, але і тых, хто не заняты поўны працоўны дзень або знаходзіцца ў адпачынку за свой кошт з прычыны прастою.

Для наймальніка, калі ён арганізуе перанавучанне работнікаў, якія апынуліся пад пагрозай звальнення, каб потым працаўладкаваць іх на іншую пасаду, прадугледжваецца кампенсацыя з боку дзяржавы.

Наймальнік павінен паведаміць аб свабоднай вакансіі органам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў пяцідзённы тэрмін.

Законапраект дае новыя магчымасці для прафесійнага навучання. Адначасова замацоўваюцца абавязкі беспрацоўных і дэкларуецца павышэнне іх адказнасці за парушэнне заканадаўства аб занятасці насельніцтва. Напрыклад, калі беспрацоўны не будзе наведваць заняткі, ён можа на год пазбавіцца права станавіцца на ўлік у цэнтры занятасці.

Грамадзянам, якія прайшлі альтэрнатыўную службу, будуць давацца поўныя гарантыі адносна варыянтаў працаўладкавання.

Папраўкі, прынятыя ў закон аб занятасці, будуць тычыцца не толькі грамадзян Беларусі, але і пастаянна пражываючых у нашай краіне замежных грамадзян і асоб без грамадзянства.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

**Святлана БУСЬКО,** *busko@zviazda.by*

**Да тэмы**

**ПЛАНУЮЦЦА ЗМЕНЫ І Ў ДЭКРЭЦЕ АБ САЦЫЯЛЬНЫМ УТРЫМАНСТВЕ**

**Будзе ўдакладнены пералік асоб, якія падпадаюць пад дзеянне Дэкрэта №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства». Пра гэта заявіў першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны насельніцтва Андрэй ЛАБОВІЧ.**

**У прыватнасці, зыходзячы з практыкі прымянення гэтага дэкрэта, будзе ўдакладнены пералік асоб, якія не трапяць пад дзеянне дакумента. Таксама будзе ўдакладнены механізм выплаты збору асобамі, якія будуць прызнаны абавязанымі кампенсаваць расходы дзяржавы.**

■ Найлепшыя з найлепшых

# «СТУДЭНТ ГОДА» — ПРАГРАМІСТ І ТВОРЧАЯ НАТУРА




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**«Маша@БДУІР разам ужо два гады і 3 месяцы. Што гэта значыць для Машы? 297 360 хвілін удваіх. 101 прачытаная кніга. 225 новых сяброў. 24 экзамены. 1 таблетка валяр'янкі. 7 спантанных учынкаў. 21 рэпетыцыя. 70 прапушчаных пар. 2 дні нараджэння. 556 радасных момантаў. 3 рэкорды. 4 факультэцкія вечарынкі. 220 важных спраў. 281 прыемны ўспамін. 266 лабараторных. 703 абеды. 199 пончыкаў. 50 кубкаў кавы. Маша@БДУІР— у іх наперадзе яшчэ два гады».**

Менавіта гэты ролік з вялікім адрывам перамог у намінацыі «Студэнт года ONLINE» ў фінале Рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года — 2015». Яго аўтар — студэнтка 3 курса факультэта камп'ютарных сістэм і сетак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Марыя МАРЧУК. Адкрытае галасаванне праходзіла ў сацыяльных сетках, дзе кожны ахвотны мог пакінуць свой голас за той ці іншы ролік фіналіста. Сёлета за тытул «Студэнт года — 2015» змагаліся дзевяць найлепшых студэнтаў — пераможцы рэгіянальных этапаў. Але для Машы шлях у фінал аказаўся самым няпростым: першапачаткова ў заключны этап спаборніцтваў павінны былі прайсці толькі тры прадстаўнікі ад сталіцы і студэнткі БДУІР сярод іх не было. Аднак Цэнтральны камітэт БРСМ (па хадайніцтве гаркама) прыняў рашэнне, што ў фінале будуць прадстаўлены не тры, а чатыры мінскія студэнты. Менавіта Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі з'яўляецца ідэйным натхняльнікам конкурсу «Студэнт года», які праводзіцца ў краіне, пачынаючы з 2011 года.

«Візітная картка», «Партфоліа», Маладая Беларусь», конкурс аратарскага майстэрства, абарона маладзёжных праектаў — адзнакі сумірующа за ўсе этапы, і, нарэшце, са сцэны Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта журы аб'яўляе абсалютнага пераможцу. **Званне «Студэнт года» заваявала студэнтка БДУІР Марыя Марчук!**

Як прызналася Марыя журналісту «Звязды», яе перамога — вынік працы цэлай каманды: «Нам усім вельмі хацелася перамагчы. Гэта штосьці невераго дна...»

Нягледзячы на тое, што дзяўчына ўжо працуе на палову стаўкі ў кампаніі, якая займаецца распрацоўкай банкаўскага праграмнага забеспячэння, яна цудоўна спраўляецца з камерай і мікрафонам, таму што супрацоўнічае з Маладзёжным тэлебачаннем БДУІР. Кажа, што незалежна ад таго, у якой сферы яна будзе далей рэалізоўвацца, досвед ад зносінаў з людзьмі, атрыманы падчас «журналісцкай дзейнасці», лішнім дакладна не будзе. Марыя ўзначальвае студэнцкі савет факультэта, дапамагае на кафедры весці справаводства. З'яўляецца ўдзельніцай паэтычнага тэатра «Рытмы сэрца»... Калі толькі ўсё паспявае? Плюс выдатна спявае, хоць сама даволі крытычна ставіцца да свайго вакальнага майстэрства (лічыць яго аматарскім).

— Калі паступала ў БДУІР, меркавала, што стану «тэхнаром», але ж мая творчая натура ўсё роўна рвецца наверх, — усміхаецца дзяўчына.

Дарэчы, два гады таму яшчэ абітурыентка Марыя перамагла ў творчым конкурсе эсэ «Мая мара — БДУІР». Яе мара спраўдзілася — яна стала студэнткай адной з самых прэстыжных у моладзі ВНУ спецыяльнасцей «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання». А пры паступленні дзяўчына набрала 386 балаў з 400 магчымых!

— Як правядзеш першы дзень у зорным статусе? — пацікавіліся мы ў пераможцы.

— Буду здаваць лабараторныя... Выкладчыкі, пакуль я рыхтавалася да фіналу, ішлі мне насустрач, — шчыра адказала Марыя і дадала: — «Зорная хвароба» да студэнтаў БДУІР прычапіцца не можа, гэта дакладна не пра наш універсітэт. Я разумею, што маё званне — гэта яшчэ і вялікая адказнасць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

# ШАКАЛАДНЫЯ РЭКІ, ВАФЕЛЬНЫЯ БЕРАГІ

## «ЗВЯЗДА» ДАВЕДАЛАСЯ, ЯК РОБЯЦЦА ЦУКЕРКІ

**Кандытарскую фабрыку можна знайсці літаральна па водары — апетытны пах какавы разносіцца на ўсё наваколле. І даросламу чалавеку складана ўтрымацца, каб не пачаць глытаць слінкі, а што ўжо казаць пра малых! Дарэчы, нядаўна ў дзяцей з'явілася магчымасць на ўласныя вочы пабачыць, як вырабляецца любімая слодыч, ну і, вядома, пакаштаваць яе яшчэ «цёпленькай» — з вытворчасці. Разам з навучэнцамі сеніцкай школы мы паглядзелі на прыгатаванне самых смачных ласункаў падчас экскурсіі, на якую нас ласкава запрасіла кандытарская фабрыка «Камунарка».**




Пасля салодкай «падзарадкі» лепш засвойваюцца не толькі веды, але і казкі.

Перад тым, як адправіцца непасрэдна на вытворчасць, **спецыяліст аддзела маркетынгу і рэкламы Таццяна ЛЯШКОВІЧ** расказвае школьнікам пра фабрыку, а заадно правярае, што яны ведаюць пра шакалад. Сённяшнія экскурсанты аказаліся на дзіва падрыхтаванымі: яны без цяжкасцей адказвалі, з чаго робіцца гэты салодкі прадукт, які з яго відаў самы карысны і нават дзе з'явілася першая цукерка. Для цікаўных: шакалад робіцца з какава-бабоў, самы карысны — горкі, ну а першая цукерка з'явілася ў Егіпце — гэта быў змочаны ў мёдзе фінік.

Але любы шкаляр вам скажа, што чым весці размовы пра шакалад, лепей яго... Думаеце, есці? Адказ правільны, але не зусім. Бо больш захапляльным за паяданне можа быць толькі працэс вытворчасці цукерак! Таму Таццяна Ляшковіч расказвае, што можна і чаго нельга рабіць у цэхах, пасля выдае ўсім спецадзенне — аднаразовыя шапачкі і накідкі, і, нібы чародка белых пухнатых птушанят, школьнікі выпырхваюць з залы ўслед за сваім экскурсаводам.

Па дарозе Таццяна расказвае, што асаблівасць вытворчасці на фабрыцы — поўны цыкл перапрацоўкі какава-бабоў. Спачатку іх абсмажваюць, пасля гэтага здымаюць шалупінне і атрымліваюць прадукт — какаву цёртую. З яе робяць какава-масла і парашок, потым змешваюць з імі розныя кампаненты і адліваюць гатовы шакалад.

Найперш мы трапляем у цэх, дзе некалькі месяцаў таму ўсталявалі новую лінію для вытворчасці цукерак з желейнымі, памаднымі і іншымі начынкамі. Толькі за адну гадзіну тут вырабляюць 1,5 тоны салодкіх ласункаў! А робіцца гэта так: у спецыяльных ёмістасцях змешваецца маса для начынкі, якая разліваецца ў формы. Далей цукеркі паступаюць на глазураванне. Пасля адпраўляюцца на ахаладжванне, праходзяць праз металадэтэктар (ён дапамагае выявіць пабочныя элементы, якія не павінны трапіць у гатовы прадукт) і потым — на загортванне. Працэс гэты цалкам аўтаматызаваны, кожная цукерка загортваецца за лічаныя секунды. Работніку застаецца толькі ўзважваць неабходную іх колькасць, якая ссыпаецца ў каробкі.

Далей нас праводзяць па лініі, дзе робіцца ласункі з буйнымі дабаўкамі — разнастайнымі арэхамі і сухафруктамі. У шакалад яны дабаўляюцца і змешваюцца ў вялікіх цыстэрнах. Адлітыя вырабы па канвееры паступаюць на пярвічнае загортванне (у фольгу). Пасля машына аўтаматычна адлічвае патрэбную колькасць шакаладак і батончыкаў, маркіруе і ўпакоўвае ў другую абгортку.

У наступным цэху па канвееры рухаюцца свежаспечаныя «нарыхтоўкі» для шакаладных цукерак з вафельнай асновай. Залацістыя квадратныя вафельныя лісты, яшчэ цёплыя, Таццяна здымае са стужкі транспарцёра і дае пакаштаваць экскурсантам. Нават без шакаладу і начынкі — смаката!

Але — не адрываемся ад вытворчага працэсу. Калі брыкет з дзвюх вафелек і начынкі паміж імі сфармаваны, ён адпраўляецца на ахаладжванне ў спецыяльную прыладу. Пасля гэтага брыкет трэба разрэзаць на асобныя цукерачкі. Далей — глазуроўка, ахаладжванне, зноў металадэтэктар і загортванне. Калі палітыя шакаладам цукеркі «плывуць» па транспарцёры да дэтэктара, адзін з маленькіх экскурсантаў заўважае, што ў агульнай плыні засталася не цалкам заглазураваная цукерка. «Гэта не страшна, работнікі яе ўбачаць і адсартуюць», — запэўнівае Таццяна Ляшковіч.

Ці варта казаць, што ад экскурсіі па фабрыцы і ласункаў дзятва і дарослыя былі ў захапленні? Да таго ж у падарунак школьнікі атрымалі кніжкі «Новыя прыгоды Шубуршуна» Алеся Карлюкевіча ад Выдавецкага дома «Звязда». Таму смак роднай мовы для іх атрымаўся салодкім ва ўсіх сэнсах!

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

■ Чытаюць усе!

### СУСТРЭНЕМСЯ З КАЛЯДНАЙ КАЗКАЙ

**Навагоднія святы — гэта заўсёды час сапраўднага чараўніцтва, добрага настрою і шчаслівых усмешак. І, вядома, прыемных сустрэч!**

ААТ «Белкніга» і РВУ «Выдавецкі дом "Звязда" запрашаюць дзяцей, а таксама дарослых, якія не страцілі веру ў цуды, здзейсніць невагоднае падарожжа па чароўным свеце дзіцячых казак і вершаў.

Акунуцца ў святочную атмасферу мерапрыемства, якое праводзіцца ў межах рэспубліканскай акцыі «Сямейнае чытанне», можна будзе **15 снежня з 12.00 да 15.00** — менавіта ў гэты час у мінскім «Доме кнігі «Светач» (пр-т Пераможцаў, 11) адбудзецца кніжны марафон «КАЛЯДНАЯ КАЗКА». Наведвальнікі змогуць пазнаёміцца з цудоўнымі дзіцячымі творамі беларускіх пісьменнікаў, пра якія раскажуць самі аўтары: Анатоль Зэкаў, Галіна Пшонік, Віктар Кажура, Яна Явіч.

Госці святочнага мерапрыемства змогуць набыць кнігі для дзяцей з аўтографамі аўтараў. Акрамя таго, падчас марафону ўсіх пакупнікоў кніг РВУ «Выдавецкі дом "Звязда"» чакаюць прыемныя падарункі.

Чакаем вас на кніжным марафоне! І не забудзьцеся ўзяць з сабою добры настрой!

■ У праекце

### НОВЫЯ ФОРМЫ АБАРОНЫ БЕСПРАЦОЎНЫХ

**Дапамогу па беспрацоўі плануецца павялічыць да ўзроўню бюджэту пражытачнага мінімуму (на сённяшні дзень БПМ у сярэднім на душу насельніцтва складае 1 567 810 руб.). А пачынаючы з 2017 года ў планах — страхаванне па беспрацоўі.**

Як заявіў **першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ,** гэтыя новыя формы абароны беспрацоўных закладваюцца ў праекце праграмы садзейнічання занятасці на 2016-2020 гады. Дадзеныя меры прадугледжаны ў сувязі з тым, што з прычыны мадэрнізацыі, якая праводзіцца на прадпрыемствах, прагназуецца павелічэнне вызвалення дадатковай колькасці работнікаў.

Органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, служба занятасці, акрамя дапамогі ў працаўладкаванні, прапануюць беспрацоўным праходжанне перанавучання. Зараз, па словах Андрэя Лабовіча, праводзіцца перанавучанне больш чым па 120 спецыяльнасцях, запатрабаваных на рынку працы.

### КАЗАЦЬ АБ ПАВЫШЭННІ ПЕНСІЙНАГА ЎЗРОСТУ ЗАЎЧАСНА

**Як заявіў учора першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй Лабовіч, аб павышэнні пенсійнага ўзросту зараз гаворка не ідзе.**

«Вы ўсе выдатна чулі словы Прэзідэнта, што без згоды і гатоўнасці народа павышэння не будзе», — сказаў першы намеснік міністра. Разам з тым ён адзначыў, што ў Беларусі ёсць эканамічная неабходнасць у павышэнні пенсійнага ўзросту.

Але неабходныя межы павышэння Андрэй Лабовіч не канкрэтызаваў. «Разглядаецца шмат варыянтаў», — сказаў ён.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Нашы дзеці

### СВЯТОЧНЫЯ ЁЛКІ ДЛЯ МАЛЕЧЫ

#### Выканаць навагодняе жаданне можа кожны

**Юбілейная, 20-я, навагодняя дабрачынная рэспубліканская акцыя «Нашы дзеці» распачалася ўчора ў нашай краіне і працягнецца да 10 студзеня. Выканаць жаданні малечы ў гэты час могуць не толькі афіцыйныя ведамствы краіны, але і ўсе неабыякавыя грамадзяне.**

*— Акцыя «Нашы дзеці» — гэта сведчанне яднання дзяржавы і грамадскіх арганізацый,* — зазначыла **начальнік упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Марыя САРОТНІК.** — *Галоўная яе задача — клопат пра кожнае дзіця, у першую чаргу пра тых, хто апынуўся ў складанай жыццёвай сітуацыі.*

Самае маштабнае святочнае мерапрыемства, вядома ж, Галоўная ёлка краіны, куды з усіх рэгіёнаў Беларусі 23 і 24 снежня з'едуцца 2370 дзяцей-сірот і тых, хто застаўся без бацькоўскага клопату. Яны наведаюць цырк і ўбачаць спектакль пра віртуальны Новы год.

У рамках акцыі святочныя мерапрыемствы і падарункі парадуюць дзяцей са школ-інтэрнатаў і дзіцячых дамоў, апякунскіх, прыёмных і шматдзетных сем'яў. Не забудуцца і на тых, хто знаходзіцца ў гэты час у аддзяленнях дзіцячых бальніц, сацыяльных прытулках, спецыяльных навукова-выхаваўчых і лячэбна-выхаваўчых установах, цэнтрах карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

*— Акцыя «Нашы дзеці» дазваляе аказаць канкрэтную падтрымку найменш абароненым катэгорыям дзяцей,* — заўважыла Марыя Саротнік. — *У мінулым годзе атрымана 5,7 млрд рублёў матэрыяльнай дапамогі. Зрабіць маленькі цуд для дзяцей могуць усе ахвотныя, а не толькі зацікаўленыя ведамствы.*

**Ірына СІДАРОК**

■ Футбол

### «У НАС БЫЛА НАДЗЕЯ...»

#### БАТЭ завяршыў выступленне ў еўракубках

**Для таго, каб забяспечыць далейшы ўдзел у Лізе чэмпіёнаў ці ў Лізе Еўропы, нашай камандзе абавязкова трэба было ў апошнім туры групавой стадыі ў гасцях перамагаць «Рому».**

Задача, безумоўна, складаная, але далёка не невырашальная.

І матч атрымаўся звышнапружаным. Беларусы дзейнічалі сапраўды добра. Выдатна згуляў Сяргей Чэрнік, варатар БАТЭ, востра ў атацы глядзеўся Ігар Стасевіч. Быў у беларусаў стапрацэнтны момант, і калі б Міхаіл Гардзейчук яго рэалізаваў, быць бы ў Барысаве еўракубкавай вясне. Матч у Рыме завяршыўся нічыйным лікам — 0:0. Разам з «Барселонай» яна працягне барацьбу за лігачэмпіёнскі кубак. Беларускі клуб з 5-баламі заняў чацвёрты радок у квартэце «Е».

— Гэты момант (удар Гардзейчука. — **Аўт.**) нам будзе доўга сніцца, — кажа **Аляксандар ЕРМАКОВІЧ, галоўны трэнер БАТЭ.** — У нас была надзея, але яна памерла. Аднак пры гэтым хачу сказаць, каманда дзейнічала выдатна. Хлопцы малайцы.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

■ Ну і ну!

### «ВАШ БІЛЕТ?» А ЯНА — У АКНО

**Відэаролік пра тое, як безбілетніца вылазіць праз фортку сталічнага тралейбуса, што з'явіўся ў сеціве, многія спачатку ўспрынялі як нейкі розыгрыш. Гаварылася, што сюжэт зняў кіроўца «рагатага».**

З яго каментарыяў па-за кадрам вынікала, што пасажырка без білета папалася кантралёрам. Выходзіць адмовілася, таму даехала да канчатковага прыпынку, дзе яе і закрылі ў тралейбусе, выклікаўшы міліцыю. Але дзяўчына не разгубілася і вылезла праз фортку. Як высветлілася, усё гэта было праўдай: такая гісторыя насамрэч здарылася ў мінулую нядзелю.

Выклік паступіў у 15.26, супрацоўнікі аператыўна былі на месцы. У райаддзел даставілі і 32-гадовую безбілетніцу, і двух кантралёраў-мужчын (некаторыя крыніцы дагэтуль пісалі, што канфлікт адбыўся паміж дзвюма жанчынамі — пасажыркай і кантралюючай асобай. — **Аўт.**), распавяла ў Партызанскім РУУС г. Мінска Наталля Ганусевіч. Тут безбілетніца напісала заяву на кантралёраў, абвінавачыўшы іх у тым, што яны біццам бы білі яе па руках, не давалі выйсці з тралейбуса. Адзін з кантралёраў напісаў заяву на пасажырку, абвінавачыўшы ў сваю чаргу тую ў паклёпе. Праводзіцца праверка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ**
**унитарного предприятия «Поречье Белкоопсоюза»**

| | | | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток, руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | Административное здание, инв. № 500/С-46538. Г.п. – 1948. Этажей – 1. Общая площадь – 85,7 м². Составные части и принадлежности: Одноэтажный каменный дом с одной отапливаемой пристройкой и двумя холодными пристройками | **г. Минск, ул. Платонова, д. 31а** | **1 027 200 000** | **102 720 000** | **5** |

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,0311 га с кадастровым номером 500000000008001584 предоставлен на праве аренды по 28.02.2022. Целевое назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания административного здания. Описание права, ограничения (обременения) прав: - охранная зона водопровода, площадь 0,0163 га; - охранная зона телефонной канализации, площадь 0,0062 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) дней с назначенной даты проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 30 (тридцати) дней с момента заключения договора купли-продажи.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 3% (трех процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 12.01.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**
*Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже здания УП «Поречье Белкоопсоюза»,* **проводимом 12 января 2016 г.**
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2.
Окончание приема заявлений – **06.01.2016 в 12.00.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Хильчук Сергей Петрович, 8 (029) 698-04-24.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект (лот) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

■ Сацыяльная кансультацыя

# ЯШЧЭ РАЗ АБ ПРАЦОЎНЫХ КАНТРАКТАХ



**Ці мае права працадаўца заключаць або прадаўжаць кантракт на тэрмін менш за адзін год? Які максімальны тэрмін дзеяння кантракта?**

Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.07.1999 № 29 «Аб дадатковых мерах па ўдасканаленні працоўных адносін, умацаванні працоўнай і выканаўчай дысцыпліны» прадугледжана, што тэрмін кантракта павінен складаць не менш за адзін год. Таму заключаць кантракт на карацейшы тэрмін забаронена.

Цяпер што датычыцца працягнення кантракта. На сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі размешчана інфармацыя аб тым, што падаўжэнне кантракта ў межах максімальнага тэрміну яго дзеяння (пункт 2 артыкула 17 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь) ажыццяўляецца па пагадненні бакоў на тэрмін, таксама не меншы за адзін год. На меншы тэрмін кантракт працягваецца з пісьмовай згоды работніка.

Максімальны тэрмін тэрміновага працоўнага дагавора (у прыватнасці кантракта) не можа быць большы за 5 гадоў.

***

**На якія тэрміны заключаюцца кантракты з работнікамі передпенсійнага ўзросту, а таксама з працуючай жанчынай, якая знаходзіцца ў водпуску па цяжарнасці і родах?**

Згодна з інфармацыяй, размешчанай на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі, пры заключэнні кантракта з работнікам, працоўны дагавор з якім быў заключаны на нявызначаны тэрмін, а таксама падаўжэнні альбо заключэнні новага кантракта тэрмін яго дзеяння вызначаецца наступным чынам:

— з работнікам перадпенсійнага ўзросту (жанчыны — 53 гады, мужчыны — 58 гадоў), які добрасумленна працуе і не дапускае парушэнняў працоўнай і выканаўчай дысцыпліны, — не менш чым да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту (жанчыны — 55 гадоў, мужчыны — 60 гадоў) і атрымання ім права на пенсію па ўзросце;

— з цяжарнай жанчынай, з якой ужо заключаны кантракт, з яе згоды ён прадаўжаецца на перыяд цяжарнасці або іншы тэрмін па пагадненні бакоў. Пры гэтым, калі з цяжарнымі жанчынамі, а таксама жанчынамі, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў (дзяцей-інвалідаў — да 18 гадоў), былі заключаны працоўныя дагаворы на нявызначаны тэрмін, без іх згоды кантракты з імі не заключаюцца;

— з працуючай жанчынай, якая знаходзіцца ў водпуску па цяжарнасці і родах; маці (альбо бацькам дзіцяці замест маці, апекуном), якая знаходзіцца ў адпачынку па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў — не менш чым да заканчэння названых водпускаў;

— са згоды маці (альбо бацькі дзіцяці замест маці, апекуна), якая пачала працаваць да або пасля заканчэння водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, — на тэрмін, не меншы, чым да дасягнення дзіцем узросту пяці гадоў. Калі максімальны тэрмін кантракта з маці заканчваецца да дасягнення дзіцем узросту пяці гадоў, наймальнік абавязаны заключыць новы кантракт на тэрмін да дасягнення дзіцем пяцігадовага ўзросту, але не менш чым на адзін год.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО,**
*busko@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

# МАЛЕНЬКІЯ ТРАГІКАМЕДЫІ



## Чым небяспечныя нашы серыяльныя слабасці

Нядаўна ў Мінску на паштальёна, якая разносіла нямоглым старым іх пенсіі, напалі проста ў пад'ездзе жылога дома, сярод белага дня. Зламысьнік некалькі разоў стукнуў няшчасную драўлянай качалкай па галаве, збіў з ног. Але жанчына змагла падняцца і кінулася ўцякаць. Спрабавала зачыніць перад носам бандыта цяжкія ўваходныя дзверы, але той падставіў нагу, не даючы гэта зрабіць. Праўда, хутка ўцёк, пакінуўшы ў дзвярах важную ўліку — красоўку...

Перапужаная ахвяра тут жа выклікала міліцыю. Праваахоўнікі спрацавалі аператыўна і па гарачых слядах затрымалі... 77-гадовую жыхарку пад'езда. Парык, другую красоўку і «зброю злачынства» бабуля-разбойніца паспела выкінуць, але ва ўсім прызналася. І тут ужо следчыя не ведалі, абурацца, здзіўляцца ці рагатаць.

Бо высветлілася, што старая, апантаная аматарка дэтэктыўных серыялаў, убачыла ў адным з іх, як чалавека аглушылі драўлянай палкай адным ударам (добра, што не забілі, а то і яна б той качалкай лупіла і лупіла). Вось бабулі і цікава стала, ці атрымаецца ў яе тое самае. Узброілася па ўсіх дэтэктыўных правілах, начапіла на галаву парык і, выйшаўшы на справу, сцішылася ў цёмным закутку пад'езда. Паштальёнцы проста не пашанцавала зайсці туды першай.

Дзякуй Богу, для яе ўсё скончылася добра — некалькі сінякоў. Чаго не скажаш пра бабулю. Ёй, нягледзячы на ўзрост, прызнанне і захапленне падобнымі адзін на адзін фільмамі, свецідь цяпер ад трох да дзесяці гадоў там, дзе тэлевізар адзін на ўсіх і строга па раскладзе.

Я думаю, калі справа дойдзе да суда, версія пра любоў да серыялаў будзе прынятая да ўвагі. Бо людзей, што «шчыльна падселі» на дэтэктыўныя, любоўныя, настальгічныя бясконцыя гісторыі, якіх штодня хапае ў тэлевізары (я ўжо не кажу пра камп'ютар) у нас нямала, калі не сказаць зашмат. Праўда, гэта не параўнаць з часамі «Багатых, якія таксама плачуць» і першымі гадамі «Санта-Барбары» — калі паказвалі іх, жыццё ўвогуле спынялася. Ваша пакорная слуга аднойчы не магла выехаць з раённай аўтастанцыі ў родную вёску паўтары гадзіны, бо пачаўся адзін з гэтых серыялаў і яго праз вокны і акенцы кас пачалі глядзець усе. Вадзіцелі забыліся, што ім трэба ў рэйс, касіры — што трэба абілечваць, дыспетчары — што трэба аб'яўляць, пасажыры — што яны збіраліся кудысьці ехаць... Масавы псіхоз, як той казаў, у наяўнасці.

Цяпер такога нідзе не ўбачыш, але тут іншая бяда: серыялы сталі больш якасныя, праўдападобныя. Асабліва дэтэктыўныя. Гэткае практычнае кіраўніцтва па высочванні і пераследаванні ахвяры, па замятанні слядоў (наша бабка і тая парык і качалку выкінула). Я ўжо не кажу пра нейкія крыміналісцкія панацэі — тут мы наогул усё прымаем на веру. І становімся буйнымі спецыялістамі ў раскрыцці злачынстваў па фанціку ад цукеркі ці па слядах самаката.

І ўсё б нічога, але мы гэтыя сваё нічым не пацверджаныя, нярэдка проста прыдуманыя аўтарамі гэтых самых серыялаў «веды» надзейна складаем у памяці (а раптам спатрэбяцца?). І тады атрымліваецца або трагедыя (расказвае нядаўна адзін урач, як не выратавалі мужыка ад апендыцыту, бо жонка, калі забалеў жывот, дала яму... грэлку — яна, маўляў, у кіно бачыла — і суткі не выклікала «хуткую», бо ўсё ж такі, у кіно, само прайшло). Або трагікамедыя — гэта я пра бабулю, якая, трэба аддаць ёй належнае, у праўдзівасці «кіно» засумнявалася і ўсё вырашыла на ўласным досведзе выправіць.

Вялікая сіла інфармацыйных тэхналогій? Наша ўласная дурасць і нежаданне думаць і аналізаваць? Пэўна, усяго патроху. А яшчэ — адзінота сярод людзей, калі вірлівае, пакручастае жыццё ў серыялах падмяняе жыццё сапраўднае, у якім анічога не адбываецца. Як у той нашай чытачкі, якая аднойчы напісала ў газету: маўляў, здароўе стала падводзіць, а любімага серыяла і канца не відаць. Дык вы, шаноўныя, надрукуйце, чым усё скончыцца, а то раптам памру і не даведаюся...

А куды ўцячы нам, маладзейшым, ад штодзённых клопатаў, ад праблем? Гэта ж так проста — націснуць на кнопку пульта і з канапы назіраць, як падобныя праблемы на раздва вырашаюцца. Гэта ж прасцей, лягчэй, чым пагаварыць з дамашнімі пра штосьці важнае або не вельмі, падумаць, пачытаць разумную кнігу, зрабіць штосьці ў хаце. Навошта, калі сябар — блакітны экран — падкажа, як жыць, як кахаць, як лячыцца, як уцячы ад бандыта і ад міліцыі? Так можна страціць самога сябе? Нічога страшнага — ёсць шмат серыялаў і фільмаў, у якіх менавіта пра гэта і пра «спосабы пошуку». Паслужлівая памяць падкажа які-небудзь сюжэт.

А вы не ведаеце, чаму па першым канале серыял «След» пасля «Панарамы» не паказваюць? Я ўжо каторы вечар не шлындаю па кватэры, шукаючы, куды сябе дзець. Сёння вось гэтыя радкі напісала. А заўтра чым заняцца? Давядзецца галаву паламаць...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**
*alena@zviazda.by*

■ Літара закона

# ПАКОЙ ДЛЯ ПАЦЯРПЕЛЫХ,

## або Праўда дзіцяці супраць цынізму дарослых

**Нават 3-4-гадовыя дзеці, якія пацярпелі ад сексуальных злачынстваў, могуць выступаць на судзе паўнацэннымі сведкамі праз відэазапісы размоў з імі, зробленых у спецыяльным дружалюбным пакоі апытанняў. Прысуды, вынесеныя пры наяўнасці такіх доказаў, больш зразумелыя і трапныя, і іх амаль немагчыма абскардзіць.**

На жаль, праблема сексуальнага гвалту над непаўналетнімі носіць схаваны характар, таму што і сама ахвяра, і яе блізкія часта не вераць у пакаранне злачынцы, саромеюцца суседзяў, баяцца плётак, а часам нават не звяртаюць увагі на скаргі дзіцяці.

*— Доказная база пры сексуальных злоўжываннях вельмі зыбкая. Часта не толькі адсутнічаюць сведкі такіх дзеянняў, але можа нават не быць і фізічных, рэчавых праяў здарэння, дзякуючы якім медыцынскі эксперт мог бы выявіць інцыдэнт, а следчы — даказаць віну злачынца, —* **расказаў Юрый АСЦЯНКА, начальнік галоўнага ўпраўлення псіхіятрычных экспертыз Дзяржкамітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь.** *— У такім выпадку вельмі важныя паказанні дзіцяці, якое заставалася сам-насам з гвалтаўніком, і яго дзіцячае слова супраць слова дарослага, які цудоўна ведае, як выкручвацца з сітуацыі і цынічна перайначыць абставіны здарэння. Наша задача — сабраць як мага большую доказную базу, каб дапамагчы пакараць злачынца. Дзеля гэтага мы асвойваем новыя віды экспертыз, уводзім новыя тэхналогіі.*

Адна з навінак апошніх гадоў, якое працуе ў Беларусі ўжо некалькі гадоў, — дружалюбны пакой для апытанняў дзяцей. Каб завяваць давер малога, падрыхтаваныя да падобных размоў псіхолагі згодна са спецыяльным пратаколам фармулююць пытанні на мове, адаптаванай пад пэўны ўзрост і ўзровень развіцця дзіцяці.

Падчас апытання карыстаюцца паліграфам, а праз двухбаковае шкло — люстэрка з боку пакоя і акно з боку следчых — цудоўна відаць усё, што адбываецца. Дзве відэакамеры фіксуюць працэс. Адна паказвае адсутнасць у пакоі, дзе гавораць з дзіцем, лішніх асоб, другая фіксуе дэталі яго паводзін.

*— Дзякуючы якаснаму запісу матэрыялаў размоў яны высока ацэньваюцца суддзямі і з'яўляюцца асноўным доказам пры вынясенні рашэння па справе,* — **кажа Анжаліка НАЗАРАНКА, дзяржаўны медыцынскі судовы эксперт-псіхолаг Дзяржкамітэта судовых экспертыз Беларусі.** *— Як правіла, гэтая ацэнка выліваецца ў важкія прысуды.*

З гэтага года такія запісы з'яўляюцца афіцыйным доказам у судзе, што замацавана ў Крымінальна-працэсуальным кодэксе Беларусі. Па ініцыятыве міжнароднага грамадскага аб'яднання «Разуменне» і з дапамогай аператыўных работнікаў Міністэрства ўнутраных спраў і прадстаўнікоў Следчага камітэта Беларусі цяпер плануецца афіцыйна замацаваць патрабаванне апытваць пацярпелых не больш за адзін раз.

Акрамя таго, апытваць маналетніх ахвяр гвалту трэба адразу пасля здарэння, бо тады атрымліваюцца самыя лепшыя і якасныя паказанні. Праз некалькі месяцаў штосьці, натуральна, забываецца, знікаюць з памяці дзіцяці дэталі, на ўспаміны пра інцыдэнт накладваецца інтэрпрэтацыя гэтага факта дарослымі, — словам,



карысць ад далейшых апытанняў з цягам часу губляецца. На 4-5-ты раз праўды ў паказаннях дзіцяці ўжо амаль не застаецца, таму самае першае і адзінае апытанне — найлепшы сродак, упэўнены спецыялісты.

*— Экспертыза дзіцяці прызначаецца крыху пазней, калі яно ўжо атрымлівае статус пацярпелага. Мы можам правесці экспертызу яшчэ да завядзення крымінальнай справы, аднак у гэтым выпадку трэба будзе сустракацца з дзіцем двойчы. Лепш за ўсё праводзіць экспертызу ў межах расследавання, —* заўважыў Юрый Асцянка. *— Дзякуючы відэазапісам апытання, праведзенага спецыялістам, мы вывучым у дэталях і зробім высновы, ці магло малое на той час даваць паказанні, ці можна карыстацца імі ў судзе. Аналізуючы досвед абвінавачвальных прысудаў, мы бачым карысць і станоўчы эфект ад запісаў размоў. Па іх складаецца відавочная карціна злачынства, справу значна лягчэй даказаць.*

**Ірына СІДАРОК**

## «ДАЧНЫ ЎЛОЎ» ЗЛОДЗЕЯ

У Смалявіцкім раёне супрацоўнікі Мінскай міжрайінспекцыі пераследавалі аўтамабіль, які не спыніўся для праверкі па іх патрабаванні. Машына ехала ноччу па прасёлкавай дарозе ў бок Жодзіна, таму дзяржінспектары западозрылі, што кіроўца можа быць датычным да браканьерства. Каля вёскі Бабін Лес шлях «жыгулям» перакрылі. Незаконнай здабычы, сетак і стрэльбаў у машыне не знайшлі. Аднак падазрэнні дзяржінспектараў выклікала вялікая колькасць дачнай маёмасці, якая перавозілася ў легкавіку: два трымеры, дзве «балгаркі», дзве вадзяныя помпы і дзве рыдлёўкі. Патлумачыць, адкуль у яго ў аўтамабілі столькі рэчаў, кіроўца не змог. Як пазней высветлілі ў міліцыі, усе гэтыя інструменты 30-гадовы жодзінец скраў на дачах. Заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ПРОДАЕМ
СЕТКА-РАБИЦА от производителя – 155 000 рублей;
ТЕПЛИЦА 3 410 000 рублей;
СТОЛБЫ 91 500 рублей;
ПРОФИЛЬНЫЕ ТРУБЫ, ВОРОТА, ПРОФЛИСТ, БЕСЕДКИ
БЫТОВКА МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ 12 960 000 рублей;
АРМАТУРА, КАЛИТКИ, КРОВАТЬ МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ, ПОСТЕЛЬНОЕ БЕЛЬЕ, ДВЕРЬ МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ 1 350 000 рублей
ДОСТАВКА БЕСПЛАТНАЯ! В течение 2–5 дней
Консультация по телефонам: +375 33 311 66 71, +375 29 947 19 44.
УНП 391802438



## Анжаліна МІКУЛЬСКАЯ:

# «ДА НАС ТРАПЛЯЮЦЬ МНОГІЯ, ЗАСТАЮЦЦА АДЗІНКІ»

**Сярод тых, хто стварае якасны «прадукт» на беларускім тэлебачанні, імя дырэктара Дырэкцыі спецыяльных праектаў тэлеканала АНТ можна смела ставіць у ліку першых. Прафесіяналізм гэтай жанчыны праяўляецца ва ўменні арганізоўваць творчы працэс, увасабляць самыя разнастайныя ідэі і прагназаваць запатрабаванні гледачоў. «Пра тое, што ты ўяўляеш сабой як прафесіянал, сведчыць якасць створанага прадукту», — адзначае наша гераіня. І яе праграмы: «Я спяваю», «Акадэмія талентаў», «Я люблю Беларусь», «Міс Інтэркантыненталь» і іншыя запомніліся і застаюцца цікавымі для многіх. І поспех іх — гэта сведчанне таго, што мы маем, калі любім сваю справу.**

### Поспехі іншых радуюць больш

***— Анжаліна Уладзіміраўна, вось ужо пяць гадоў вы ўзначальваеце аддзел спецыяльных праектаў тэлеканала. Па якіх са сваіх праграм, што ўжо сталі гісторыяй, вы сумуеце і, можа, хацелі б вярнуць іх у эфір?***

— Я да прызначэння на пасаду доўгі час працавала на АНТ пазаштатна. І вылучаць менавіта пэўны перыяд складана. Было створана шмат разнастайных праектаў: ад забаўляльных, музычных — да інтэлектуальных, псіхалагічных. «Зорны цырк» — адзін з нашых першых праектаў, ён быў складаным, працаёмкім. Але пасля яго засталося шмат эмоцый, адкрыццяў. «Пасаг для маладой», «Я спяваю» таксама з ліку любімых праектаў, якія запомніліся. Але жаданне вярнуць нейкі праект на экраны — справа рызыкоўная, бо нішто не існуе адасоблена, само па сабе. Важны і кантэкст таго, што адбываецца ў пэўны час навокал. І прыемна бачыць, як працягваюцца гісторыі нашых герояў: нараджаюцца дзеці, з'яўляюцца новыя перамогі. Я заўсёды радуюся за іх. Зараз мы абмяркоўваем праграмы на наступны год і разумеем, што патрэбен нейкі пералом. Быў час, калі папулярнымі былі музычныя праграмы, цяпер назіраецца інтарэс да шоу талентаў. Мы адчуваем, што наспеў час прапанаваць штосьці новае. І рыхтуемся зрабіць свой ход.

***— Вы ўпэўнены ў сабе прафесіянал. Чаму выбралі ролю «закадравага чалавека»?***

— У кожнага свой шлях. Адзін праце ўрачом і адчувае сябе ўпэўнена, другі — выхавальнікам у дзіцячым садку, і таксама паўнавартасны. Калі гаварыць пра сцэну, то я яе не баюся, але ва ўсіх нас розныя амбіцыі, і я не адчуваю асалоды, калі мной нехта захапляецца. Хутчэй пачынаю саромецца. Нават свой дзень народзінаў святкаваць не люблю. Сапраўдная радасць для мяне, калі ў маёй камандзе ўсё выдатна атрымалася. Вось уявім, апладзіруюць нам гледачы, і тады я за заслонай перапоўнена эмоцыямі, бо мы гэта зрабілі! Радуюся таксама, калі ўдзельнікі нашых праектаў потым недзе зноў перамагаюць, альбо тэлевядучым уручаюць узнагароду. Такія адзнакі для мяне больш каштоўныя, чым проста адчуць сваю непаўторнасць.

***— Узнагароды, званні рознага кшталту сёння маюць значэнне?***

— Людзей трэба заахвочваць у працы. Ёсць два метады ўздзеяння: альбо ты тлумачыш чалавеку, што ён нішто і той пачынае даказваць адваротнае, ці другі варыянт: супрацоўніку кажаш пра яго ўнікальнасць, і той стараецца паводзіць сябе адпаведна. Я за апошні варыянт. Каб даваць іншым магчымасць паказваць сябе. Пахвала для любога з нас з'яўляецца штуршком для руху, таму не варта маўчаць, калі ёсць за што адзначаць працу. А ў нас людзі часам стрымліваюць сябе ў жаданні падбадзёрыць іншых і, думаю, дарма.

### Рабіць магчымым немагчымае

***— Скажыце, а вы глядзіце праграмы на іншых тэлеканалах?***

— Я раблю гэта прынцыпова, каб не паўтарыцца пры стварэнні сваіх праектаў. Для мяне вельмі важна не супадаць. Разам з тым мне дастаткова бачыць нейкую прыгажосць, рэчы, гарады ці ўвогуле нейкую дробязь, і мой мозг пачне нараджаць ідэю. Я проста здольная ацаніць добрыя хады і адзначыць сабе, што варта стварыць новае. У калег зараз з'яўляюцца якасныя праекты, аднак жорсткай канкурэнцыі на рынку арыгінальных праектаў не назіраецца, а хацелася б яе бачыць.

***— Каманду тых людзей, з кім працуеце, доўга падбіралі?***

— Мая праца не прадугледжвае адзіноты, і ў ёй вельмі істотна, хто знаходзіцца побач з табой. Тут няма месца пазіцыі: я так бачу і так вырашыла. Людзі павінны адчуваць сябе творцамі. Як толькі будзе адчуванне ў кожнага, што ён важны, тады справа пойдзе на лад. Калі ж адзін геній, а іншыя проста выконваюць яго распараджэнні, то не гарантавана, што наступным разам людзі пойдуць за табой, бо ў кожнага ёсць самалюбства. Таму сфарміраваць каманду — вельмі важная задача. Я ўвесь час вельмі карпатліва шукаю людзей, з якімі хачу супрацоўнічаць. Кожная праца мае сваю спецыфіку: нехта можа хораша гаварыць, хтосьці прыгожа піша музыку і спявае, а ў нас людзям трэба ўмець трымаць у галаве ўвесь арганізацыйны працэс. Трапляюць да нас многія ў каманду, а застаюцца назаўсёды толькі адзінкі. Варта памятаць, што мы прадстаўляем марку тэлеканала АНТ. Уражанне ад нас — думка пра нашу арганізацыю.

***— Не баяліся страціць творчую свабоду, пагадзіўшыся на кіруючую пасаду?***

— Я не кар'ерыстка і ніколі не гналася за пасадамі, бо мне здаецца, што яны заганяюць чалавека ў рамкі. Межы, правілы існуюць, таму я і працавала доўгі час пазаштатна, бо хацелася, каб іх было як мага менш. З часам прыняла прапанову працаваць у штаце, і цяпер вельмі ўдзячная кіраўніцтву тэлеканала, што мы супрацоўнічаем, давяраючы і разумеючы адно аднаго. З мяне не зрабілі чыноўніцу, хоць хапае і кабінетнай працы, папер. Галоўнае, ніхто не перашкаджае займацца сваёй любімай працай.

### Універсальныя рэцэпты шчасця

***— Якія рэсурсы і выдаткі сёння патрэбны для стварэння добрага праекта на беларускім тэлебачанні?***

— Тут не існуе дакладнага адказу, бо, напрыклад, можна мець вялікія фінансы, але не знайсці добрай ідэі, як і наадварот: як бы што ні блішчэла, яшчэ не гарантыя, што глядач застанецца задаволеным. Бывае ўсё проста — і ідэя, і знята за невялікія грошы, але ад экрана не адарвацца. Універсальнага рэцэпта, думаю, ніхто не дасць. Зразумела, якасныя тэлевізійныя праекты патрабуюць немалых грошай, аднак у аснове поспеху ляжыць ідэя.

***— Калі ў працы здараюцца форс-мажорныя сітуацыі, які ваш стыль паводзін?***

— Я заўсёды захоўваю спакой і цвяроза прымаю рашэнні адносна таго, як можна выправіць тую альбо іншую сітуацыю. Мая каманда таксама не паддаецца паніцы, але, працуючы з кімсьці ўпершыню, у такіх выпадках даводзіцца іх супакойваць, а перажыванні трымаць у сабе. Пасля заканчэння праекта мне трэба зрабіць перапынак хаця б на дзень, а вечарам я зноў пачынаю сумаваць па працы.

***— Ведаю, што вы выраслі ў сям'і ваеннага і ў Мінск пераехалі з Расіі. Якімі былі першыя ўражанні?***

— Пераезд у Беларусь быў маім самастойным рашэннем, калі я захацела паехаць за сваімі бацькамі. На той час бацьку перавялі ў запас, і яны з мамай вырашылі вярнуцца на месца яго першапачатковай службы. Тады я ведала пра гэтую краіну толькі з аповедаў маці, якая тут нарадзілася. Яна вельмі сумавала ў нашых падарожжах па тутэйшых мясцінах. Увогуле, назіраючы за мамай, за тым, якой мяккай і спакойнай яна была нават у размовах, у мяне складвалася ўражанне, што ўсе беларусы такія. Прыехаўшы сюды, я не расчаравалася. Але тады ўпершыню адчула настальгію па мінулым жыцці. Іншыя правілы існавання, новыя незнаёмыя людзі. Мой тэлефон практычна маўчаў. Разам з тым я была прыемна ўражана тым, якое тут стаўленне да сям'і, да традыцый, што тут паважаюць меркаванні іншых... Цяпер нават у размовах са сваімі аднакласнікамі, сябрамі ўжо адзначаю, што я дома.

> **«Пахвала для любога з нас з'яўляецца штуршком для руху, таму не варта маўчаць, калі ёсць за што адзначаць працу».**

***— На ваш погляд, чым сёння можна ганарыцца беларусам?***

— Беларускі народ, на мой погляд, вельмі выхаваная нацыя. Тут людзі імкнуцца ўкладаць усё ў будучыню сваіх дзяцей. Ні ад кога на вуліцы не чакаеш агрэсіі, хутчэй можна сустрэць жаданне дапамагаць. Гэтыя якасці я цаню ў беларусах. Памятаю і тое, што ў мяне карані беларускія. Напрыклад, сярод маіх родзічаў, якімі наша сям'я ганарыцца, — Марат Казей. Яго сястра Ада Іванаўна ў свой час прывіла любоў майму сыну да беларускай мовы... Таксама вельмі прыемна назіраць, як праяўляецца любоў да ўсяго свайго: вышыванак, мовы, народнай музыкі... Прычым моладзь актыўна адгукаецца на ўсё, ніхто нічога не навязвае. І ўсё гэта сведчыць, што нацыя захавалася і ёсць патрэба ў народа любіць і паважаць сваё.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*


ЗВЯЗДА *Да чытача з любоўю!*

# НЕ ШУКАЮЧЫ, НЕ ЗНОЙДЗЕШ,

## не гуляючы, не выйграеш!

■ Падпіска-2016

**Што было — было. Кажуць, мужык адзін штовечар маліў: «Божухна, дапамажы мне выйграць прыз у звяздоўскай латарэі, Божухна, дапамажы мне выйграць...»**

**І так — дзень пры дні, тыдзень пры тыдні!**

**Не вытрымаў Бог — адазваўся, сказаў: «Чалавеча, дык памажы і ты мне — падпішыся хоць раз на гэту газету, запоўні картку...»**

Многія з нашых адданых сяброў на «Звязду» ўжо падпісаліся, многія, хочацца верыць, плануюць гэта зрабіць у найбліжэйшыя дні. А нехта, магчыма, і вагаецца, бо... ні разу не выйграў. І калі б спрабаваў — дасылаў свае карткі на розыгрыш прызоў, не так крыўдна было б. А калі не?..

У любым выпадку ў гэтыя пераднавагоднія дні ў кожнага з індывідуальных падпісчыкаў ёсць шанц паспрабаваць: нядаўна (у нумары за 9 снежня) надрукаваны правілы гульні, там жа — пералік прызоў. Сярод іх — сем мультыварак і кухонны камбайн Bosch, а таксама зборнічак рэцэптаў «Навагодні фэст ласункаў»...

Карацей, да свята — гэта тое, што трэба! Для любой сям'і. У мультыварцы, напрыклад, можна хутка зварыць шыкоўны халадзец альбо запячы ў так званым рукаве мяса ці курыцу, з дапамогай камбайна — умомант нарэзаць гароднiну для салата (рэцэпты дадаюцца).

Што трэба, каб выйграць гэтыя рэчы? Падпісацца на «Звязду» на першы квартал або паўгоддзе, запоўніць картку (да канца года яна будзе друкавацца па суботах) і даслаць у рэдакцыю. А там...

Яшчэ продкі заўважалі: не шукаючы, не знойдзеш, не гуляючы, не выйграеш.

Паспрабуйце. А раптам?

У любым выпадку ў гэтай гульні прайграўшых не будзе, бо да ўсіх падпісчыкаў пяць разоў на тыдзень будзе прыходзіць «Звязда» — любімая газета нашых бацькоў і дзядоў, найстарэйшая, беларускамоўная. Як пісаў пра яе адзін з чытачоў:

«Ты адно запомні, браце:
Са «Звяздой» цяплей у хаце!»
Ці не так?






## ПРЫНАМСІ САГАН ВЯХОТКАЙ МЫЮЦЬ

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Чалядні́к** — рамеснік у цэхавага майстра. *Зайшоў чаляднік у каморку і пачаў шыць боты.*

**Вяхо́тка** — тое, што і мачалка.

**Кагане́ц** — даўнейшае прыстасаванне для асвятлення памяшкання. Каганец ставілі ці падвешвалі пад вусцем дымахода.

**Сага́н** — чыгунны гаршчок. *«Маці на стол высыпала бульбы гару з сагана»— радкі Максіма Танка.*

**Балазе́** — тым больш што, добра што. Злучнік, размоўная слова. *Вучыся, балазе ёсць умовы.*

**Прына́мсі** — ва ўсякім разе. Пабочнае слова. *Да вечара дзень цягнуўся вельмі марудна, прынамсі яму так здавалася.*

**Легчы касцьмі** — 1) загінуць у баі; 2) пастарацца зрабіць любым спосабам. Беларусы яшчэ скажуць — скласці галаву, заснуць вечным сном, хоць трэсні, хоць забіся. Руская — «лечь костьми». Выраз «касцьмі легчы» фіксуецца ў старажытным летапісе, паводле якога князь Святаслаў перад бітвай з грэкамі ў 970 годзе сказаў сваім ваярам: «Не посрамим зе́мли русския, но ляжем костьми ту; мертвие бо срама не имут». А яшчэ гэты выраз у сваім другім значэнні сінанімічны з выразам «з калена выламаць».

**З калена выламаць** — прыдбаць, дастаць, зрабіць нерэальным, немагчымым спосабам. Беларускія сінонімы: кроў з носа, праўдамі і няпраўдамі, хоць камяне з неба. Рускі — «любой ценой».

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** iost@zviazda.by

## ПАНЯДЗЕЛАК, 14 СНЕЖНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.10** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 22.50** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05** Клуб рэдактараў.
**10.45 Серыял «На край свету».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.45 Камедыя «Тарыф Навагодні».**
**13.35, 15.50 Меладрама «Пакуль жыву, кахаю». 1—2-я серыі.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00, 21.45 Дэтэктыў «Ваенная разведка. Першы ўдар». 1—2-я серыі.**
**21.00** Панарама.
**23.30** Дзень спорту.
**23.40 Меладрама «Каралі».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 10.10, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05** «Арол і Рэшка. Шопінг». Стайл-шоу.
**10.45** М/с «Сябры анёлаў».
**11.20** Азбука смаку.
**12.00 Дэтэктыў «Метад Фрэйда 2».**
**14.05** «Разбуральнікі міфаў».
**15.10 Камедыя «Дурдом на колах».**
**17.00** Перазагрузка.
**17.55 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**18.55 Серыял «Кухня».**
**19.55 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**22.05** КЕНО.
**22.10** «Арол і Рэшка». Трэвел-шоу.
**23.10** Рэпарцёр.
**0.00 Серыял «Косці».**
**0.45 Серыял «У эфіры».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.40** «Сусветная карцінная галерэя».
**7.55, 13.00, 16.40, 23.20** «Калейдаскоп».
**8.10 «Гараж». Трагікамедыя.**
**9.45** «Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**10.40** «Наперад у мінулае».
**11.10, 13.15, 16.55, 21.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.40 «Сын за бацьку». Драма.**
**13.25 «Не бядуй!» Камедыя.**
**14.55 «Дзённік яго жонкі». Драма.**
**17.00 «Воўчая зграя». Драма.**
**18.30 «Тайны палацавых пераваротаў». Драма. «Другая нявеста імператара».**
**20.10, 22.50** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**20.40** «Калыханка».
**21.30 «Асабістыя рахункі». Драма.**
**23.35** «Геапалітыка: свет за тыдзень».

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.05, 19.20** PRO спорт. Навіны.
**7.15** Баскетбол. НБА. «Бруклін» — «Кліперс».
**9.05** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. ЦСКА (Масква) — «Цмокі-Мінск».
**10.45** Біятлон. Этап Кубка свету. Хохфільцэн. Спрынт. Жанчыны.
**12.10** Біятлон. Этап Кубка свету. Хохфільцэн. Спрынт. Мужчыны.
**13.45** Спорт-мікс.
**14.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Лёсаванне раўнда плэй-оф.
**15.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Лёсаванне раўнда плэй-оф.
**16.05** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Рыга) — «Дынама» (Мінск).
**18.05** Авертайм.
**18.35** Час футбола.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Ёкерыт» (Хельсінкі) — «Мядзвешчак» (Заграб).
**21.40** PRO спорт. Вынікі.
**22.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**23.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Лестэр» — «Чэлсі».
**0.55** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здарова!»
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.15** «Смак».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Адваротны адлік». «Гетман Агінскі. Палеская авантура». Фільм першы.
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15 Мюзікл «Стылягі».**
**0.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне».
**10.00** «Далёкія сваякі».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50** «Эліксір маладосці».
**14.35** «Такі лёс».
**15.20** «Іншая краіна». «Вострава шанцавання: што шукае Беларусь у Інданезіі».
**16.50** «Вялікі горад».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы»: «Хто знайшоў карабель?».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна».
**23.00** «Тыдзень спорту».
**23.30 Маст. фільм «Нерэальная поўнач».**
**1.00** «Дакументальны праект»: «Старажытнакітайская Русь», «Астраномы старажытных светаў».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Беларусь сёння».
**9.30 Серыял «Чужыя мары», 1—2-я серыі.**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 21.10 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**16.20, 1.00** Дак. серыял «Іншы свет».
**16.50, 1.30** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**17.20 Серыял «Бурштынавы барон».**
**19.25 Серыял «Развод».**
**22.05 Маст. фільм «Трэці лішні».**
**23.55** Галоўная тэма.
**0.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**2.00** — Прафілактыка.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** Ток-шоу «Што адбываецца».
**12.40** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30** «Наш чалавек».
**18.20 Серыял «Сямейны дэтэктыў».**
**20.55 Серыял «Земскі доктар».**
**21.55, 23.10 Серыял «Афіцэрскія жонкі».**
**23.50** «Сумленны дэтэктыў».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05 Серыял «Адвакат».**
**7.10** «Акцэнты тыдня».
**8.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Ядзім дома».
**14.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**16.20** Серыял «Ліцэйны».
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Іншы маёр Сакалоў».**
**21.25 Серыял «Пятніцкі. Глава чацвёртая».**
**23.10** «Анатомія дня».
**23.50 Серыял «Каманда».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.45, 21.05, 23.55** Надвор'е.
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.50 Серыял «Злачынная імперыя».**
**8.20 Трылер «Сонная лагчына».**
**10.00, 16.30** «Аналітычная праграма».
**10.10 Драма «Падмена».**
**12.30** «Кінаблакнот».
**12.45, 13.50, 15.45, 16.40, 18.25, 19.35, 21.00** «Хатняя крама».
**13.00 Серыял «Героі».**
**14.10 Серыял «Палюбоўніцы».**
**17.00 Серыял «Пад купалам».**
**18.30 Серыял «Каханне імператрыцы».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Трылер «Мой анёл-захавальнік».**
**23.20 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».**

### ВТБ

**6.00, 7.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**6.30, 8.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00** «Кіно ў дэталях».
**10.00** Кулінарнае шоу «Майстаршэф. Дзеці».
**11.00, 14.00, 20.00** Серыял «Як я стаў рускім».
**12.00** Фэнтэзі «Дарыян Грэй».
**15.00, 5.00** Серыял «Нефармат».
**16.00** «Турбаміксер».
**17.00, 4.00** «Лаві момант».
**17.30, 0.00** «Уральскія пельмені».
**18.00, 23.30** Серыял «Святлафор 5».
**19.00** Серыял «Маладзёжка 3».
**21.10** Камедыя «Як выйсці замуж за мільярдэра».
**23.00, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30, 5.30** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».

### КУЛЬТУРА

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.40** «Наглядальнік».
**11.15, 23.50** «На ўсё астатняе жыццё...» Маст. фільм. 1-я серыя.
**12.25, 22.40** «Пётр Фаменка. Лёгкае дыханне». Дак. фільм. Частка 1-я.
**13.15** «Калі я стану вялікім». Маст. фільм.
**14.40, 19.00, 2.35** «Сусветныя скарбы культуры».
**15.10** «Больш, чым каханне». Мікалай Рыбнікаў і Ала Ларыёнава.
**15.50** «Сёмае неба». Маст. фільм.
**17.25** «Silentium». Дак. фільм.
**18.25** Да 100-годдзя з дня нараджэння Георгія Свірыдава. «Завея». Музычныя ілюстрацыі да аповесці А.С. Пушкіна.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Саці. Нясумная класіка...»
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.10** Урачыстая цырымонія адкрыцця IV Санкт-Пецярбургскага міжнароднага культурнага форуму. Закрыццё Года літаратуры ў Расійскай Федэрацыі. Трансляцыя з Марыінскага-2.
**23.45** Мастсавет.
**1.20** Р. Шчадрын. Канцэрт № 3 для фартэпіяна з аркестрам.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1990. Паўтор ад 2010 года.
**7.05, 8.40, 11.30, 12.45, 13.55, 15.25, 17.00, 19.05, 21.40, 23.00, 1.10, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.30** Дак. фільм «Ці будзе камунізм?».
**9.00** «Быў час». 2008 год.
**10.00** Маст. фільм «Кароткія сустрэчы».
**12.00** «Акулы пяра». Сяргей Мазаеў. 1997 год.
**13.30** Дак. фільм «Эцюд пра каханне».
**15.00** Дак. фільм «Вялікі містыфікатар».
**16.00** Маст. фільм «Дзівак-чалавек».
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. Мікалай Аруцюнаў, Сяргей Воранаў. 2005 год.
**19.25** Маст. фільм «Буйная размова».
**20.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР».
**1.25** Маст. фільм «Дзе ты, Багіра?».
**4.00** «Колба часу».

### EUROSPORT

**5.00, 10.30, 17.00** Зімовыя віды спорту.
**6.00, 11.30, 23.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**7.30, 20.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**8.30, 13.00, 20.45** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**9.30, 15.30, 22.30, 3.00** Снукер. Еўратур. GIBRALTAR OPEN. Фінал.
**14.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Лёсаванне.
**15.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Лёсаванне.
**18.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Фінал. Лепшыя моманты.
**21.30, 1.35** Конны спорт. ROLEX GRAND SLAM.
**23.45** Футбол. Еўрагалы.
**1.00** Футбол. MLS. Лепшыя моманты.
**1.05, 2.00** Футбол. Веліч футбола.
**1.30** WATTS! Спецыяльны снежаньскі выпуск.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.40, 17.45, 22.00, 3.00** Серыял «Былыя».
**6.25** Камедыя «Няўдачлівы».
**8.00** Меладрама «Домік у сэрцы».
**10.35** Камедыя «Два светы».
**12.25** Камедыя «12 калядных жаданняў».
**14.00, 14.50, 15.40, 0.50, 5.45** Скетчком «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (шоу)».
**16.00** Камедыя «Пяць нявест».
**18.45** Меладрама «Чужое вяселле».
**20.20** Камедыя «Вяселле па абмене».
**23.10** Меладрама «Закахацца ў нявесту брата».
**1.15** Камедыя «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі».
**4.00** Камедыя «Кухня ў Парыжы».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.15** «Доктар І...»
**8.45, 19.05, 1.35** «Гісторыя кахання». Серыял.
**10.05, 3.45** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.55, 4.30** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.50** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.45** «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
**13.45** «Прадказанне». Маст. фільм.
**15.30, 3.00** «Нераскрытыя тайны».
**16.25** «Мой герой».
**17.15, 5.20** «Смех — сакрэтная зброя». Дак. фільм.
**18.05** «Чалавек-прынада». Серыял.
**20.55, 0.50** «Берагі маёй мары». Серыял. Заключная серыя.
**21.55** «Двайное жыццё». Серыял.
**23.00** «Часова даступны».
**0.00** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.25, 2.20** Камедыя «А вось і Полі!».
**8.10** Драма «Галгофа».
**10.00** Драма «Тэрэза Д».
**12.00** Драма «Дзіяна: гісторыя кахання».
**14.00** Трылер «Жанчына ў чорным».
**15.50** Драма «Змоўшчыца».
**18.00** Меладрама «Джэйн Эйр».
**20.00** Драма «Джо».
**22.00** Драма «Тайная цяга».
**23.50** Трылер «Палонныя».
**3.50** Драма «Не злоўлены, не злодзей».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Касцюм Арлекіна».
**8.00** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Князь ветру».
**10.05** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Дом спатканняў».
**11.40** Драма «Алеся».
**13.05** Меладрама «Вернасць».
**14.30** Прыгоды «Скарбы О.К».
**16.20** Баявік «СМЕРШ».
**18.45** Драма «Клас карэкцыі».
**20.20** Баявік «Васьмёрка».
**21.50** Драма «24 гадзіны».
**23.20** Фэнтэзі «Ваўкадаў».
**1.10** Драма «Дом ветру».
**3.00** Камедыя «Аддамся ў добрыя рукі».
**4.45** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... бацька нявесты».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 17.10, 3.45** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 13.45** Гульні розуму.
**7.10** Займальная навука.
**7.35, 13.20** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Золата Юкана.
**8.45, 12.35** Незвычайныя промыслы.
**9.30, 14.10, 19.30** Прарыў.
**10.20, 14.50, 20.15** Сучасныя расследаванні.
**11.00** Сіла племені.
**11.50, 22.30** Сканеры старажытнага свету.
**15.40** Самыя небяспечныя жывёлы.
**16.25** Дзікая прырода Расіі.
**18.00** Мегазаводы.
**18.40** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**21.00, 0.45, 4.30** Асушыць акіян.
**21.45, 0.00, 1.30, 5.15** Расследаванні авіякатастроф.
**23.15** Тайны гісторыі.
**3.00** Апошнія тайны Трэцяга рэйха.

### DISCOVERY

**8.00, 12.30** Дарожныя каўбоі.
**8.50** Атам.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Прапажы на продаж.
**11.35, 7.10** Гульня на жыццё.
**13.25, 19.00, 6.25** Не спрабуйце паўтарыць.
**15.15, 5.35** Хуткія і гучныя.
**16.10, 3.00** Махінатары.
**18.00** Трой.
**20.00** Эфект Карбанара.
**22.00** Дзікая кухня.
**23.00** Голыя і напалоханыя.
**1.00** Драпежнікі буйным планам.
**2.00, 4.50** Бітвы за кантэйнеры.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

## ПАЛЕСКАЯ АВАНТУРА АГІНСКАГА

**14 і 21 снежня тэлеканал АНТ пакажа новы фільм «Гетман Агінскі. Палеская авантура» дакументальнага праекта «Адваротны адлік» ад рэжысёра Уладзіміра Луцкага.**

...Князь Міхаіл Казімір Агінскі быў тыповым прадстаўніком сваёй эпохі і сваёй дзяржавы — Рэчы Паспалітай. Ім рухалі мары, ягонымі ўчынкамі кіравалі захапленні і амбіцыі. У гаспадарчыя справы сваіх маёнткаў ён амаль не ўнікаў.

У 1763 годзе ён зрабіў спробу заняць трон Рэчы Паспалітай, але яна не мела поспеху. Неўзабаве Агінскі змог атрымаць пасаду гетмана Вялікага Княства Літоўскага. Але непрыдатнасць Агінскага да ваеннай службы выявілася вельмі хутка — калі ён быў ушчэнт разбіты тады яшчэ нікому не вядомым расійскім военачальнікам Аляксандрам Суворавым. У 1767 годзе адбылася падзея, якая шмат у чым змяніла жыццё гетмана. Агінскі атрымаў ліст з палескай глушы, дзе знаходзіліся яго маёнткі. Малады правінцыйны чыноўнік Мацей Бутрымовіч прапаноўваў увасобіць у жыццё грандыёзны праект. Неабходныя выдаткі былі роўныя вялізнай маёмасці князя. Агінскі вырашыў рызыкнуць і пайшоў ва-банку, бо гэтая авантура давала яму ўнікальную магчымасць увекавечыць сваё імя. Тады ён нават і ўявіць не мог, што рызыкоўнае мерапрыемства ператворыць правінцыйны Слонім у адзін з найбуйнейшых партоў Рэчы Паспалітай.

Як Агінскаму ўдалося ўвасобіць мару ў рэальнасць? І чаму ўсяго праз пару дзесяцігоддзяў Пётр Вяземскі параўнае гэты горад са старажытным Рымам? Адказы даведаемся з новага фільма «Адваротны адлік» 14 і 21 снежня ў 18.20 на АНТ.

## СУБОТА, 19 СНЕЖНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.10** Існасць.
**7.35** Слова Мітрапаліта Паўла на дзень Свяціцеля Мікалая Цудатворца.
**7.45, 21.40 Меладрама «Каханне нечакана нойдзе».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.40** Трансфармацыя.
**10.15** «50 рэцэптаў першага».
**10.55** Выйсце ёсць.
**11.30** «Кацярына Вялікая».
**12.10** «Здароўе». Ток-шоу.
**12.55** Нашы.
**13.10, 15.45 Дэтэктыў «Неверагодныя прыгоды Аліны». 1—4-я серыі.**
**15.15** Краіна.
**21.00** Панарама.
**1.00** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**6.50** М/с «Сябры анёлаў».
**7.25** Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
**7.55 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**10.05** Азбука смаку.
**10.40** М/с «Сябры анёлаў».
**11.45 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**13.45** Капейка ў капейку.
**14.20** «Арол і Рэшка. Шопінг». Стайл-шоу.
**15.20** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**16.30** «Бітва экстрасэнсаў. Вайна тытанаў».
**18.45 Трылер «Ван Хельсінг».**



**21.05** Тэлебарометр.
**21.10 Меладрама «Іншаземка».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.30** Хачу ў тэлевізар!
**23.35** «Арол і Рэшка. Нязведаная Еўропа». Трэвел-шоу.
**0.35 Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны». Заключная серыя.**

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 13.35, 16.15, 23.55** «Калейдаскоп».
**8.15, 13.50, 16.30** «Размаўляем па-беларуску».
**8.20 «Вяртанне рэзідэнта». Дэтэктыў.**
**10.35** «Брэсцкая крэпасць». Дак. фільм.
**11.20 «Брэсцкая крэпасць». Драма.**
**14.25** «Да мяне, Мухтар!» Прыгоды.
**15.45** «Камертон». Галоўны рэжысёр Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Аляксандр Козак.
**16.35 «Уся каралеўская рацъ». Дэтэктыў. 1—3-я серыі.**
**20.00** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя тайны». «Хто забіў сенатара, або Сапраўдная гісторыя ўсёй каралеўскай раці». Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Дазвольце расказаць!» Паэт, кампазітар, заслужаны артыст Расіі Яўген Шахрай.
**21.15 «Край». Драма.**
**23.20** «Бард-парад».

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.30** PRO спорт. Навіны.
**7.40** Хакей. Ароса-чэлендж. Швейцарыя — Нарвегія.
**9.30** Хакей. Ароса-чэлендж. Славакія — Беларусь.
**11.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Спрынт. Жанчыны.
**13.05** Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Гонка праследу. Мужчыны.
**13.55** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**14.25** Піт-стоп.
**14.50** Футбол. На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**15.20** Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Гонка праследу. Жанчыны.
**16.10** Баскетбол. НБА. «Сан-Антонія» — «Кліперс».
**18.10, 22.10** Хакей. Ароса-чэлендж.
**20.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Норвіч».
**0.25** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «Разумніцы і разумнікі».
**12.50, 16.20** Серыял «Начныя ластаўкі».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.50** «Вольга Аросева. Рэцэпт яе шчасця».
**17.50** «Тэорыя змовы».
**18.50** «Аффтар жжот!»
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.35 Меладрама «Выпадковы раман».**
**0.20 Маст. фільм «Зніклая імперыя».**

### СТБ

**6.20** Фінал Міжнароднай лігі КВЗ.
**8.05** «Тайны Чапман».
**9.00** «Разумней не прыдумаеш з Міхаілам Марфіным».
«Сезон цудаў».
**10.00** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35** «Далёкія сваякі».
**11.50 «Салдаты 7». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 0.30 Маст. фільм «Шарада».**
**15.40** «Вадзіць па-руску».
**15.55** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.40 Маст. фільм «Любоў да сабак абавязковая».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Трылер «Трохвугольнік».**
**21.55** «Дакументальны праект»: «Вялікія тайны старажытных летапісаў».

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.15, 8.40** М/ф.
**6.45 Маст. фільм «Агонь, вада і медныя трубы».**



**8.10** «Саюзнікі».
**9.00** «Ой, мамачкі».
**9.30** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Чаму я».
**10.45 Маст. фільм «Гардэмарыны, наперад!».**
**16.15 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**18.25 Серыял «Апостал».**
**0.15** «Культпрасвет».
**1.00** «Дыяспары».
**1.30 Маст. фільм «Гэтым вечарам анёлы плакалі».**
**3.00 Маст. фільм «Вясёлая моладзь».**
**4.35 Маст. фільм «Дзеці Дон-Кіхота».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**7.30 Маст. фільм «А снег кружыць...».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Правілы руху».
**12.10 Маст. фільм «Справа была ў Пянькове».**
**14.15** «Дзве жонкі».
**15.10** «Асабістае. Барыс Клюеў».
**15.40 Маст. фільм «Ілюзія шчасця».**
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55** «Галоўная сцэна». Паўфінал.
**23.15 Маст. фільм «Мірт звычайны».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 8.20 Серыял «Адвакат».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Справа густу».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.00** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Я худзею!»
**14.15** «Ежа жывая і мёртвая».
«Мяса».
**15.10, 16.20 Серыял «Гадзіна Волкава».**
**18.05** «Следства вялі...»
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.00** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.55** «Ты не паверыш!»
**21.50** «50 адценняў. Бялова».
**22.50 Маст. фільм «Небяспечная сувязь».**
**0.45** «Час Г».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.50, 19.05, 21.00, 23.55** Надвор'е.
**9.05** М/ф.
**9.20 Серыял «Каханне імператрыцы».**
**10.20, 10.45, 15.55, 17.30** «Хатняя крама».
**10.35** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.00 Камедыя «Пра беднага гусара замоўце слова».**
**13.55 Драма «Дарагая Алена Сяргееўна».**
**15.35** Мультпарад.
**16.00** «Адшукваецца адпачынак.
**16.30 Серыял «Альф».**
**17.40 Камедыя «Мармадзюк».**
**19.10 Трылер «Доўгае падзенне».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Драма «Палонныя».**

### ВТБ

**6.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**7.00, 4.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00, 16.30** «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** Камедыя «Прыгоды Філібера».
**14.00, 23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30** «Вялікая маленькая зорка».
**15.30** Кулінарнае шоу «Майстаршэф. Дзеці».
**17.00, 0.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**17.30** «Уральскія пельмені».
**20.30** Трылер «Ларго Вінч: пачатак».
**22.45** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**23.30** «Дзікія гульні».
**3.30** «Лаві момант».
**5.00** Серыял «Свацці».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Свяціцель Мікалай. Каб смутак ператварыўся ў радасць». Дак. фільм.
**10.35** «60 дзён». Маст. фільм.
**11.50** «Жанчыны». Любімае кіно». Дак. фільм.
**12.45** «Агатавы капрыз Імператрыцы». Дак. фільм.
**13.15** Фестываль «Факел», Сочы-2015. «Мары спраўджваюцца». Дак. фільм.
**14.10** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**14.40** «Ключы ад аркестра». В.-А. Моцарт. Сімфонія № 40.
**16.15** «Больш, чым каханне». Сава Куліш і Варвара Арбузава.
**17.00** Навіны культуры з Уладзімірам Фляркоўскім.
**17.30** Выдатныя пісьменнікі Расіі. Юрый Левітанскі. Вечар у Канцэртнай студыі «Астанкіна». Запіс 1994 года.
**18.20** «Рамантыка рамансa». «Рускія народныя песні».
**19.15** «Наглядальнік». Спецвыпуск.
**20.10** Да 110-годдзя з дня нараджэння Язэпа Хейфіца. «Дрэнны добры чалавек». Маст. фільм.
**21.45** 100 гадоў з дня нараджэння спявачкі. «Невядомая Піяф». Дак. фільм.
**23.00** «Белая студыя».
**23.45** Кіно на ўсе часы. «Гэта цудоўнае жыццё». Маст. фільм.
**1.55** «Птушыны рай. Агёльскі нацыянальны парк». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Сляем, сябры!» з Таццянай Візбар. Ксенія Полцева. 2007 год.
**6.55, 8.25, 9.40, 11.00, 13.00, 15.40, 17.00, 19.15, 20.20, 21.40, 23.00, 1.10, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**8.00** Маст. фільм «Маладажон».
**8.45, 14.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1991. Паўтор ад 2008 года.
**13.30** Маст. фільм «Юлька».
**16.00** «Колба часу».
**19.30** Дак. фільм «Міхаіл Шамякін. Споведзь мастака».
**21.00** «Быў час». 2008 год.
**22.00** Маст. фільм «Мае дарагія».
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітукоўскім: «Асаблівасці нацыянальнай эліты». 2006 год.
**1.25** Маст. фільм «Пагоня».

### EUROSPORT

**5.00, 23.00** Байцоўскі клуб.
**7.00** WATTS!
**8.00** Снукер. Еўратур. GIBRALTAR OPEN. Фінал.
**9.30, 15.30, 18.00, 21.00, 3.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**10.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**11.00, 16.15, 21.45, 2.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**12.00, 18.30, 3.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**14.00, 19.00, 4.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**20.00, 1.00** Зімовыя віды спорту.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.40, 17.45, 22.00, 3.00** Серыял «Былыя».
**6.25** Меладрама «Ажанюся на першай сустрэчнай».
**8.00** Камедыя «Гамбіт».
**10.35** Камедыя «Горка».



**12.20** Камедыя «Шалёныя прэпады».
**14.00** Камедыя «Што, калі Санта...?».
**15.45, 0.45, 5.45** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Горка! 2».
**18.40** Камедыя «12 калядных сабак. Цудоўнае выратаванне».
**20.20** Камедыя «Чалавек-эльф».
**23.10** Камедыя «Superнянь».
**1.10** Камедыя «Шосты элемент».
**4.00** Камедыя «Багіня».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.50** «Дачныя гісторыі».
**10.40** «Сто пытанняў даросламу».
**11.30** «Prокіно».
**11.40** «Хронікі маскоўскага побыту».
**12.30** «Доказ віны».
**13.05, 1.00** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял
**17.15** «Турба». М/ф.
**18.40** «Лінія абароны».
**19.15** «Знак лёсу». Меладрама.
**21.25** «Перавозчык 3». Маст. фільм.
**23.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.40** «Мужчына і Жанчына. Адчуйце розніцу». Дак. фільм.

### ТБ1000

**5.20, 16.20** Меладрама «Шоўк».
**7.20, 12.40** Камедыя «Аналізуй тое».
**9.00** Драма «Полак».
**11.10** Драма «Бабёр».
**14.20** Драма «Джо».
**18.20** Драма «Добрай ночы, Месяц».
**20.00, 4.30** Меладрама «Бляск».
**22.00** Фантастыка «2012».
**0.40** Драма «Тайная цяга».
**2.40** Трылер «Урачысты фінал».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Гульні матылькоў».
**8.05** Камедыя «Хлопец з Марса».
**9.45** Меладрама «Домік у сэрцы».
**11.20** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... бацька нявесты».
**13.00** Меладрама «Вернасць».
**14.30** Баявік «Стрытрэйсеры».
**16.30** Прыгоды «Скарбы О.К».
**18.20** Баявік «Зваротны адлік».
**20.20** Маст. фільм «Мама».
**22.10** Камедыя «8 новых спатканняў».



**0.10** Трылер «Юлечка. Смяротныя ўрокі».
**2.00** Меладрама «Яшчэ адзін год».
**4.00** Трагікамедыя «Яно».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Непаражальныя канструкцыі.
**6.50, 12.35** Гульні розуму.
**7.10** Займальная навука.
**7.35, 11.50** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Золата Юкана.
**8.45** Больш чым фокусы.
**9.30** Дзікая прырода Амерыкі.
**10.20, 14.10** Навука будучыні.
**11.00** Касмічнае падарожжа «Хабла».
**13.20, 20.15** Сканеры старажытнага свету.
**14.50** Калі кракадзілы елі дыназаўраў.
**15.40** Топ-10 мегамонстраў.
**16.25** Ізумруд за 400 мільёнаў долараў.
**17.10** Шеклтан.
**18.10** Тайны гісторыі.
**18.40, 23.15, 3.00** Прарыў.
**19.30** Горшае надвор'е ў гісторыі?
10.9.4. победитель нарушает сроки получения приза, установленные Правилами (п. 11.5., п. 11.6.).

11. Срок и способ информирования победителей розыгрыша, место, порядок и сроки вручения призов.

11.1. Организатор уведомляет победителей о выигрыше по электронной почте, а также, дополнительно, по контактным номерам телефонов, указанным участниками при регистрации безналичной операции в регистрационной форме на Сайте:

11.1.1. победителей первого розыгрыша – до 10 января 2016 г. включительно;

11.1.2. победителей второго розыгрыша – до 24 января 2016 г. включительно;

11.1.3. победителей третьего розыгрыша – до 07 февраля 2016 г. включительно;

11.1.4. победителей четвертого розыгрыша – до 14 марта 2016 г. включительно.

11.2. При условии возникновения необходимости вручения призов резервным победителям Организатор уведомляет резервных победителей о выигрыше по электронной почте, а также, дополнительно, по номерам контактных телефонов, указанным участниками при регистрации безналичной операции в регистрационной форме на Сайте:

11.2.1. резервных победителей первого розыгрыша – до 24 января 2016 г. включительно;

11.2.2. резервных победителей второго розыгрыша – до 07 февраля 2016 г. включительно;

11.2.3. резервных победителей третьего розыгрыша – до 21 февраля 2016 г. включительно;

11.2.4. резервных победителей четвертого розыгрыша – до 24 марта 2016 г. включительно.

11.3. Победители/резервные победители могут получить выигранные ими призы по адресу местонахождения Организатора (г. Минск, ул. Ольшевского, 22, пом. 20, к. 46) в рабочие дни, с 10:00 до 17:00, предоставив Организатору лично:

11.3.1. свои паспортные данные (данные вида на жительство): ФИО, серия и номер паспорта (вида на жительство), дата выдачи, орган, выдавший паспорт (вид на жительство), идентификационный номер, адрес регистрации;

11.3.2. оригинал карт-чека выигрышной безналичной операции;

11.3.3. банковскую платежную карточку, по которой была совершена соответствующая выигрышная безналичная операция;

11.3.3.1. в случае закрытия карт-счета на момент получения приза – прекративший действие оригинал договора на открытие карт-счета, к которому относилась банковская платежная карточка, по которой была совершена соответствующая выигрышная безналичная операция.

11.4. В случае если победитель не может получить приз лично, приз может получить его законный представитель (доверенное лицо), предоставив лично:

11.4.1. свои паспортные данные (данные вида на жительство): ФИО, серия и номер паспорта (вида на жительство), дата выдачи, орган, выдавший паспорт (вид на жительство), идентификационный номер, адрес регистрации;

11.4.2. доверенность от победителя на получение приза, заверенную нотариально;

11.4.3. оригинал карт-чека выигрышной безналичной операции;

11.4.4. банковскую платежную карточку, по которой была совершена соответствующая выигрышная безналичная операция;

11.4.4.1. в случае закрытия карт-счета на момент получения приза – прекративший действие оригинал договора на открытие карт-счета, к которому относилась банковская платежная карточка, по которой была совершена соответствующая выигрышная безналичная операция.

11.5. Победители обязаны явиться для получения призов в следующие сроки:

11.5.1. первого розыгрыша – в срок до 20 января 2016 г. включительно;

11.5.2. второго розыгрыша – в срок до 03 февраля 2016 г. включительно;

11.5.3. третьего розыгрыша – в срок до 17 февраля 2016 г. включительно;

11.5.4. четвертого розыгрыша – в срок до 21 марта 2016 г. включительно.

11.6. При условии возникновения необходимости вручения призов резервным победителям резервные победители обязаны явиться для получения призов в следующие сроки:

11.6.1. первого розыгрыша – в срок до 29 января 2016 г. включительно;

11.6.2. второго розыгрыша – в срок до 12 февраля 2016 г. включительно;

11.6.3. третьего розыгрыша – в срок до 26 февраля 2016 г. включительно;

11.6.4. четвертого розыгрыша – в срок до 30 марта 2016 г. включительно.

11.7. Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента Призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче Призов ограничена количеством и видом призов, указанных в Правилах, и Положением об обращении Подарочных сертификатов в ООО «Электросервис и Ко».

11.8. Организатор не несет ответственности за любые риски, связанные с повреждением призов и их эксплуатацией, возникшие после передачи призов Победителям.

11.9. При получении призов победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога производится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь и осуществляется Организатором. Удержание с победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи приза из денежной части приза (денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

12. Права и обязанности участников Игры.

12.1. Принимая участие в Игре, участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования Правил и законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением призов.

12.2. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения в рамках данной Игры.

12.3. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

12.4. Участники при заполнении регистрационной формы на Сайте обязаны вводить достоверную информацию. Организатор не несет ответственности за достоверность данных, внесенных участниками в регистрационную форму, а также за последствия внесения участником недостоверной информации в регистрационную форму.

12.5. Победители, претендующие на получение призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения призов.

13. Наименование печатного издания средства массовой информации, для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.

13.1. Правила Игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Игры.

13.2. Результаты розыгрышей Игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 31 марта 2015 г.

14. Общие положения.

14.1. Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Игры, а также результаты проведения Игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.

14.2. Во избежание сомнений компания Visa International Service Association и любые ее аффилированные лица не являются Организатором, не принимают участия в розыгрыше, а также определении победителей, не несут ответственности за соблюдение Организатором Правил, законодательства Республики Беларусь, а также не отвечают по претензиям участников Игры.

14.3. Информацию об условиях участия и проведения Игры можно получить по телефону «горячей линии» +375(29) 196-17-16 с 10:00 до 17:00 в рабочие дни, а также на Интернет-сайте www.visa.com.by

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 2685 от 25.11.2015 г. выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

■ Не прапусціце!

# СУСТРЭЧА З ДЗЕДАМ ЗІМНІКАМ І БАБАЙ ЗАВІРУХАЙ



**Культурна-турыстычнаму праекту «Сядзіба дзеда Зімніка і бабы Завірухі», у якім задзейнічаны практычна ўсе клубныя ўстановы Іўеўшчыны, спаўняецца 5 гадоў. У гэтыя дні завяршаецца падрыхтоўка чарговай навагодняй праграмы і, як заўсёды, не абыдзецца без новых «фішак» — фальклорных персанажаў, забаў і конкурсаў. Пра некаторыя з іх карэспандэнту «Звязды» паведаміла арганізатарка праекта, намеснік дырэктара Іўеўскага цэнтра культуры і вольнага часу Наталля МУДРЫК.**

Рэзідэнцыя дзеда Зімніка і бабы Завірухі знаходзіцца ў вёсцы Залейкі, што літаральна на мяжы Іўеўскага і Лідскага раёнаў. Штогод да іх у госці прыязджаюць Дзед Мароз, родны брат Зімніка, і Снягурка. Прычым, мясціны тут не проста прыгожыя — казачныя! У тым сэнсе, што літаральна ўсюды можны ўбачыць вядомых фальклорных персанажаў. Ім тут так камфортна, што з кожным годам герояў казак становіцца ўсё больш. Сёлета гэта памочнік Зімніка Гномік, Чырвоны Каптурок, Ліса-кума, Салавей-разбойнік, які жыве з гаспадыняй залейкаўскіх балот Кікімарай; Баба Яга, Кашчэй Несмяротны, Ямеля (зразумела, на печы) і іншыя. Яны сустрэнуцца дзецям на шляху да сядзібы дзеда Зімніка і бабы Завірухі падчас вандроўкі па сцежцы ў казачным лесе.

Дарэчы, касцюмы для сваіх герояў работнікі культуры шыюць самі, прычым так па-майстэрску, што люба-дорага глядзець. І на касцюм Чырвонага Каптурка, якія сёлета дэбютуе ў Залейках, і на ўбранне Кікімары. А як прыгожа будзе выглядаць Ліса!

На гэты раз у казачным лесе трэба будзе адшукаць... чарадзейныя навагоднія кветкі, якія растуць толькі тут. Пры гэтым дзецям прапануюць разгадаць на сваім шляху розныя загадкі, а сабраныя кветкі яны падораць бабе Завірусе, якая дала такое заданне Гноміку. Разам з дзедам Зімнікам яны ў сваёй сядзібе сустрэнуць дзяцей навагоднім спектаклем ля ёлкі, які, зразумела, не абыдзецца без Дзеда Мароза, Снягуркі, гульняў, конкурсаў і вельмі смачных падарункаў. Праект супрацоўнічае з фабрыкай «Камунарка» і калі летась там заказалі 1500 падарункаў, то сёлета — 2 тысячы.

— Хвалююся, каб усім хапіла, бо заявак на гэтую праграму маем ужо шмат, — кажа Наталля Мудрык.

Праграма вельмі падабаецца дзецям і дарослым. Прычым не толькі нашым землякам, але і масквічам, гасцям з Італіі, якія ўжо таксама пабывалі ў казачнай сядзібе дзеда Зімніка і бабы Завірухі.

— Мы нават пісьмы ад іх атрымлівалі пасля паездкі ў Залейкі, — ганарыцца Наталля Мудрык.

Пры гэтым важна і тое, што, дастаўляючы радасць дзецям, культработнікі Іўеўшчыны дзякуючы праекту папаўняюць бюджэт сваіх устаноў і, адпаведна, паляпшаюць іх матэрыяльную базу. Цэны робяць даступнымі, але ў цэлым, дзякуючы мноству наведвальнікаў, за ўвесь час ужо зарабілі каля паўмільярда рублёў.

Дарэчы, прыехаць на навагоднюю дзею ў Залейкі можна не толькі ў складзе турыстычнай групы, але і ў індывідуальным парадку. Для выхаванцаў дзіцячых дамоў і прытулкаў спектакль будзе бясплатным — трэба толькі, каб дарослыя, якія іх суправаджаюць, прывезлі з сабой падарункі для ўручэння дзецям.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*
**Фота з архіва праекта.**

*Іўеўскі раён*

■




## ПАРАДЗІХІ

У 1965 годзе на калгаснай машыне мяне прывезлі ў вялікі драўляны дом з радзільнай залай, прасторнай палатай і двума пакоямі: для немаўлят і медперсаналу.

Аднак пра гэта я даведалася пазней. Спачатку ўбачыла сваіх суседак-парадзіх ды іхнія ложкі (аж 10 штук), адчула, што ў палаце пануе ціхая радасць, да якой дадалася і сама весялосць. «Прывезла» яе яшчэ адна маладзіца — з вялікім жыватом (яна трымала яго аберуч) і ледзь не такой жа па аб'ёме капой ярка-рыжых валасоў.

— Каця, — павітаўшыся, з усмешкай сказала новенькая, і быццам абдала нас хваляй дабрыні і весялосці, бо з яе, як з тога чароўнага рога, сталі сыпацца розныя показкі ды гісторыі. Ну вось напрыклад. На абед нам прынеслі салату. Голас Каці:

— Ой, дзяўчаты, морквачка! Я ж яе з маленства люблю! Пайду, бывала, на градку, вырву каліва, а яно тоненькае, маленькае. Дык я за яго — і назад у зямельку: няхай падрасце. А сама па градцы далей паўзу — большую шукаю...

Каця расказвае пра гэта і смяецца, прычым такім заразлівым смехам, што рагатаць пачынаюць усе. За выключэннем хіба тых, каму не да смеху ўжо: у мяне «пад тую морквачку» чарговыя схваткі пачаліся...

Ад іх ды нясцерпнага болю я пакутавала ўсю ноч: першы крык свайго сыночка пачула толькі пад раніцу...

Тады ж, ледзь жывую, мяне прынеслі ў палату, паклалі на ложак.

— Як вы сябе адчуваеце? — у хуткім часе спытала дакторка.

А я маўчу, бо не магу не тое што адказаць, нават вочы расплюшчыць.

Тады яна з іншага боку зайшла — пытае ў мяне:

— Што баліць?

Я хачу ёй сказаць: «Усё!..» А вось што найбольш? Не падымаючы век, ледзь чутна прамаўляю:

— Пяткі.

У палаце — выбух смеху. А я ж сур'ёзна, бо ногі, сагнутыя ў каленях, за некалькі гадзін нерухомасці проста ўкарчанелі, пяткі — ажно смыляць.

— Я магу табе дапамагчы? — нахіляецца да мяне Каця.

Я шэптам прашу:

— Выпрастай мне ногі.

Каця тут жа адкінула коўдру, разагнула мае калені. Мне адразу ж стала лягчэй, а вось ёй — наадварот. Бо жанчына раптам войкнула, гучна закрычала і схапілася за спінку майго ложка...

Мне было вельмі дрэнна, а стала яшчэ горш. Але ж я ўжо ведала, што такое схваткі, і чакала, пакуль яны не скончацца ў Каці.

Нарэшце жанчына прыціхла — супакоілася, у знямозе лягла на свой ложак. Я таксама з палёгкай уздыхнула. Праўда, ненадоўга, бо ў Каці пачаліся новыя схваткі, і яна чамусьці зноў учапілася ў мой ложак.

Так паўтаралася аж пакуль парадзіху не забралі ў радзалу, дзе бліжэй да вечара яна нарадзіла хлопчыка.

...Ні мабільных, ні звычайных тэлефонаў у людзей тады, можна сказаць, не было. Усе навіны з радзільні акушэрка паведамляла ў сельскія Саветы. А ўжо адтуль яны маланкамі разносіліся па акрузе і, вядома ж, дасягалі мэты. Назаўтра пад нашымі вокнамі з'яўляліся бáцькі немаўлят, іх брацікі ды сястрычкі.

— Гляньце, мае прыйшлі! — крычыць неяк Каця.

Мы прыляпіліся насамі да шыб: пад акном і сапраўды стаяў мужчына з дзвюма дзяўчынкамі: у сям'і, вядома ж, не хапала хлопчыка. А магчыма, і двух...

Прынамсі, прыехаўшы ў радзільню яшчэ раз (па дачушку), я чакала, што зараз расчыняцца дзверы, і ў палату ўвойдзе Каця.

Не збылося... Шкада.

**Дзіна Дубадзелава,**

*в. Леніна, Добрушскі раён.*

## БОГ СЦЕРАЖЭ АСЦЯРОЖНАГА

...З маленства помню: гарбузы ў нашай вёсцы даспельвалі на дахах. Не сказаць, што гэта вельмі зручна і лёгка, не сказаць, што бяспечна, але ж шмат хто прыстаўляў да будынка драбіны, на край даху вялікімі цвікамі прыбіваў тоўстыя дошкі і потым некалькі гадоў складваў за імі ўраджай.

Складваў бы, магчыма, дагэтуль, калі б...

У той год у нашага суседа дзеда Якава гародніна ўрадзіла будзь здароў! Ва ўсялякім разе гарбузоў (хай не дужа вялікіх), шмат было, дзед іх доўга цягаў на дах...

І вось настаў час здымаць. Гаспадар прынёс драбіны, прыставіў іх, нагледзеў самы гладкі і спелы гарбуз, пацягнуў за хвост. Але ж пацягнуў... разам з дошкай, якая і без таго была пад нагрузкай.

Ну і не вытрымала — варухнулася, адным канцом пасунулася ўніз.

Адпаведна гарбузы ўсе зрушыліся з месца, націснулі на прыстаўленыя драбіны. І не проста скінулі іх разам з дзедам, — можна сказаць, градам пасыпаліся самі...

Жонка, здалёк убачыўшы гэтае відовішча, ледзьве не самлела: схапілася за сэрца, знямела. Потым падбегла да кучы з крыкам:

— Яшачка, ці жывы ты?

Стары не азваўся, але ж, дзякаваць Богу, варухнуўся...

Бабуля стала спехам «адграбаць» гарбузы, падбірацца да дзеда, падала руку.

Той з яе дапамогай неяк устаў, ледзь не на карачках папоўз у хату.

...Амаль месяц ён адлежваўся на печы. А калі крыху ачуняў, выйшаў з кійком на вуліцу, стаў частаваць дзятву гатовымі гарбузікамі.

Адзін з хлапчукоў асмеліўся паспачуваць старому, спытаць, ці моцна яго пабілі... гарбузы? Дзед у адказ толькі цяжка ўздыхнуў:

— Ведаеш, — сказаў, — у 1919 годзе мяне білі бізунамі палякі, у 1944-м — яшчэ больш ад немчуры перапала... І ад гарбузоў усё цела баліць, але ж тут ужо сам вінаваты!

Пасля гэтага здарэння ніхто ў нашай вёсцы гарбузы на даху болей не спяліў. Бог сцеражэ асцярожнага. Ці не так?

**Уладзімір Пугач,**

*м. Навасёлкі, Петрыкаўскі раён*

## КАБ НЕ ТАЯ БЛАНДЗІНКА...

Пачні распытваць мужоў і жонак, як яны пазнаёміліся, дзе сустрэліся, і, відаць, непазбежна высветліцца, што вельмі шматкаго звёў выпадак — чужое вяселле, чарга да касы, паход у кіно ...

У адрозненне ад іх, мы з мужам сустрэліся... заканамерна, бо разам вучыліся ў інстытуце. А вось пажаніліся сапраўды выпадкова.

Мне тады было трошкі за 20, і пра замужжа я зусім не думала, хоць — не без таго — нехта з хлопцаў падабаўся мне, некаму падабалася я... Адзін, у прыватнасці (малдаванін, вучыўся ў нас пасля службы ў войску) час ад часу клікаў на спатканні, запрашаў у кіно, у музей, у тэатр...

Зрэдку, пад настрой, я згаджалася, і мы хадзілі, але найчасцей прыдумляла нейкую прычыну, каб адмовіцца (ну не казаць жа хлопцу, што мне з ім сумна?). Ён тады крыўдаваў, на нейкі час адступаўся, рабіў выгляд, што наогул не заўважае мяне, але ж праходзіў тыдзень-другі, і Алег, так бы мовіць, «вяртаўся»: казаў, напрыклад, што ў яго зусім выпадкова аказаліся два білеты на канцэрт маёй любімай спявачкі.

Карацей, усё пачыналася спачатку і цягнулася больш за год, аж пакуль...

У той дзень мы з Алегам вярталіся з заняткаў, ішлі па сталічным праспекце Францыска Скарыны (цяпер Незалежнасці). Нехта, як водзіцца, абганяў нас, нехта ішоў насустрач — то хуткім крокам, то так званым прагулачным... Тая бландзінка, мусіць, вельмі спяшалася.

Зрэшты, усё адбылося настолькі хутка, што мы нічога не зразумелі. Проста ўбачылі, што на асфальт перад намі падаюць нейкія паперы і... маладая жанчына.

Алег адразу ж кінуўся да яе:

— Як вы? Што баліць? — пытаўся ён, дапамагаючы падняцца. — «Хуткую» выклікаць?

— Не, не трэба, — паціраючы пабітае калена, адказала жанчына. — Прабачце мне, калі ласка! І дзякуй!

Што здзівіла, далонь пацярпелай была ў крыві, калена пад джынсамі, мусіць, таксама, але яна пры гэтым шчыра ўсміхалася, казала (па-беларуску, гледзячы на мяне):

— Вось бачыце, які ў вас мужчына, — жанкі перад ім так і падаюць, так і падаюць... Пройдзе яшчэ пяць гадоў — вось пабачыце! — штабелямі будуць укладвацца!

З гэтымі словамі, яшчэ раз падзякаваўшы нам за дапамогу, маладзіца склала ў стосік свае кніжкі-паперы і, ступаючы вельмі нясмела, падалася ў свой бок. Мы з Алегам пайшлі ў свой, але ўжо не моўчкі.

— Яна што, перш-наперш папрасіла прабачэння? — удакладніў Алег. (Трэба сказаць: яго шмат што здзіўляла ў нашай краіне).

— Так, —- адказала я.

— А за што?

— Ну, можа, за тое, што спатыкнулася, напужала нас сваім падзеннем, — выказала здагадку я.

— А потым што, нягледзячы на боль, узялася дзякаваць?..

— Так.

— І тут жа стала жартаваць?.. Ну гэта ж трэба!

Алег так дэталёва ўсё запамінаў, так шчыра здзіўляўся... Больш за тое, зусім нечакана для мяне ён зрабіў выснову, што ў гэтым эпізодзе, як у люстэрку адбіўся (ні больш, ні менш)... наш нацыянальны характар, прычым у найлепшых рысах. Ну па-першае, нягледзячы ні на што, не прычыняць ніякіх клопатаў іншым; па-другое, у любых, нават самых нечаканых абставінах, што называецца, трымаць марку і сябе ў руках — не расклейвацца і не пасаваць, па-трэцяе, не губляць прысутнасці духу і гумару...

Потым не раз яшчэ мы ўзгадвалі гэту выпадковую сустрэчу, гэты эпізод. Прычым Алег — яго пачатак, а я найчасцей — менавіта фінал, паўжартам сказаную кіношную фразу: «Вось бачыце, які ў вас мужчына, — жанкі перад ім так і падаюць, так і падаюць...»

Не паверыце, але гэтыя словы проста прымусілі мяне прыгледзецца да Алега. І ўбачыць, што ён і сапраўды не такі, як іншыя. Што ён, напрыклад, вельмі ўважлівы і клапатлівы, што ён шмат чаго ведае і ўмее, што досыць сур'ёзна ставіцца да жыцця...

Карацей, яшчэ праз год — ужо блізкага сяброўства — мы з ім згулялі вяселле, і я аказалася замужам. Гэта значыць, за мужам — без перабольшвання — як за каменнай сцяной.

І зараз — здараецца — з жахам думаю, што мы, відаць, маглі б «размінуцца», калі б не тая бландзінка з кніжкамі.

**Н. Казарына,**

*Мінскі раён*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

# МЕДНЫ ШЭЛЕГ — НАРОДНАЯ МАНЕТА

## У Брэсце адзначылі 350-годдзе мынцы

**Яшчэ на III міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Берасцейскія кнігазборы» прагучала інфармацыя, блізкая да сенсацыі: вызначана месца Берасцейскага манетнага двара (мынцы), які існаваў на тэрыторыі цяперашняй Брэсцкай крэпасці тры з паловай стагоддзі таму. І калі накont дыслакацыі той самай мынцы ў радыусе да метра вучоныя могуць спрачацца, то сам факт існавання манетнага двара ў Брэсце — рэч відавочная. Тым больш што гэта быў адзіны манетны двор на тэрыторыі сучаснай Беларусі.**

Але ж працавала прыстасаванне для чаканкі надзвычай прадукцыйна. За год — са снежня 1665 года па снежань 1666-га — адчаканілі больш за 240 мільёнаў медных шэлегаў, якія інакш называлі бараці́нкамі (па прозвішчы італьянца Ціта Бараціні, якому рашэннем Варшаўскага сейма манетны двор перадалі ў арэнду). Сярод гісторыкаў няма аднагначнай думкі накont таго, добра гэта ці дрэнна — пусціць адначасова такую колькасць новых грошай у абарачэнне. Зразумела, што колькасць паўплывала на зніжэнне вартасці, то бок абясцэніла новыя грошы. Але некаторыя праблемы эканомікі былі вырашаны, напрыклад, удалося разлічыцца з войскам, пагасіць пэўныя даўгі.

Ну а сам шэлег быў вельмі дробнай манетай, даступнай простаму люду. Таму нярэдка тыя самыя медныя шэлегі знаходзяць у полі, на агародах. Вядомы брэсцкі краязнаўца, прафесар Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта Анатоль ГЛАДЫШЧУК лічыць, што ў сялян тады было павер'е, звязанае з урадлівасцю зямлі. Перад сяўбой земляробы кідалі некалькі манет у поле на добры ўраджай. Такім чынам папярэднікі пакінулі нашчадкам магчымасць знаходзіць стара́даўнія манеткі і праз вякі...

І вось у фае Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна прынеслі цэлы мяшэчак тых шэлегаў, знойдзеных у розны час. Менавіта ў гэтай навучальнай установе, а крыху пазней — у Брэсцкім тэхнічным універсітэце — адзначылі юбілей Берасцейскага манетнага двара. І па цяперашняй традыцыі зрабілі мерапрыемства яркім, відовішчным, калі тэатралізаванай дзеяй узнавілі атмасферу эпохі Берасцейскага замка. Пад перaлівы сярэдняевечнай музыкі рэканструктары цікава і захапляльна расказалі ўдзельнікам пра вартасць і значэнне былых грошай. А майстар манетнай справы Язэп Калясецкі тут жа зрабіў з кавалка медзі саматужным спосабам аналаг таго самага шэлега — бараці́нкі. У вобразе Язэпа выступіў брэсцкі рамеснік Ігар МІХАЛЬЧУК, які даўно асвоіў выраб сувеніраў-манет і робіць гэта для турыстаў звычайна ля археалагічнага музея «Бярэсце». Праўда, яго медныя капейкі — усяго толькі сувенір. Арыгінальныя ж, якія прадставіў краязнаўчы музей, з задавальненнем разглядалі ўдзельнікі імпрэзы. На кожнай «капеечцы» XVII стагоддзя можна разгледзець выяву герба ВКЛ «Пагоні» і профіль караля Яна Казіміра.



Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Ігар МІХАЛЬЧУК дэманструе выраб аналага манеты.

Яшчэ на свяце прадаваліся паштоўкі, прысвечаныя брэсцкай манеце. Абласны філіял «Белпошты» разгарнуў цэлую выстаўку. Паштоўку можна было пагасіць на месцы і адправіць адрасату.

Андрэй ТУЦКІ, кіраўнік брэсцкага філіяла ААТ «Пріорбанк» убачыў пэўны сімвалізм у сьвяткаванні юбілею Брэсцкага манетнага двара менавіта напярэдадні дэнамінацыі і вяртання ў грашовае абарачэнне манеты. «Наяўнасць манеты ў краіне сведчыць пра ўмацаванне валюты і аздараўленне эканомікі», — заўважыў банкір і дадаў, што факт работы адзінага на тэрыторыі Беларусі манетнага двара трэба ўсяляк папулярызаваць. І паштоўка на гэтым шляху — толькі першы крок. А намеснік начальніка ўпраўлення культуры галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама Вячаслаў ГАРБУЗАЎ падкрэсліў важнасць правядзення мерапрыемства менавіта ў маладзёжнай аўдыторыі. Паводле яго слоў, студэнты абедзвюх брэсцкіх ВНУ цікавяцца гісторыяй свайго краю, і цікаўнасць іх трэба ўсяляк падтрымліваць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*yaskevich@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.18 | 16.47 | 7.29 |
| Віцебск — | 9.15 | 16.30 | 7.15 |
| Магілёў — | 9.08 | 16.37 | 7.29 |
| Гомель — | 8.56 | 16.42 | 7.46 |
| Гродна — | 9.31 | 17.04 | 7.33 |
| Брэст — | 9.24 | 17.13 | 7.49 |

## Месяц

*Маладзік у 12.29.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

***Пр.** Аляксея, Васіля, Івана, Мікалая, Пятра, Рыгора, Сцяпана, Фёдара.*
***К.** Дануты, Клары, Сабіны, Даніэля, Сцяпана.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 11 СНЕЖНЯ

**1790** год — 225 гадоў таму нарадзіўся (г. Гродна) Валяр'ян Гурскі, беларускі педагог. Вучыўся на фізіка-матэматычным факультэце Віленскага ўніверсітэта, дзе ў 1816 г. абараніў дысертацыю на ступень доктара філасофіі. Для ўдасканалення ведаў за кошт універсітэта быў накіраваны за мяжу. На працягу 4 гадоў набываў веды ў Германіі, Галандыі і Англіі. У Францыі праслухаў курс лекцый у Політэхнічнай школе і на іншых спецыяльных курсах. Пасля вяртання з-за мяжы ў 1821-м выкладаў у Віленскім універсітэце практычную механіку, а таксама навукі па будаўніцтве дарог, мастоў і каналаў. Сярод яго вучняў быў Ігнат Дамейка. У 1823 г. па даручэнні ўлад выконваў механічныя і гідраўлічныя работы ў Пецярбургу і яго ваколіцах. Дома меў багатую бібліятэку па гісторыі Віленскага ўніверсітэта. Шмат працаваў над кнігамі, займаўся бібліяграфіяй. Памёр у 1874 годзе.



**1856** год — нарадзіўся Георгій Пляханаў, рускі публіцыст і палітычны дзеяч. Прыхільнік сялянскага сацыялізму, ён верыў, што сяляне ў Расіі па прыродзе сваёй сацыялісты і гатовыя да рэвалюцыі. Пляханаў быў гарачым прыхільнікам тэрарыстычных тэндэнцый. З 1880 года Георгій Валянцінавіч жыў у эміграцыі, дзе заснаваў марксісцкую групу «Вызваленне працы». Цалкам сацыялдэмакратычная па сваёй праграме і задачах, яна была хутчэй групай выдавецкай, чым партыйнай. Група спрыяла выданням прац Пляханава, якія былі накіраваны супраць народніцтва і спрыялі распаўсюджванню марксізму ў Расіі. Ён быў адным з заснавальнікаў Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, газеты «Искра». Пасля 2-га з'езда РСДРП Пляханаў разышоўся з Леніным і быў доўгі час адным з лідараў меншавікоў. Падчас рэвалюцыі 1905 года ён выступаў супраць узброенай барацьбы з царызмам. У 1917 годзе Пляханаў вярнуўся ў Расію, падтрымліваў Часовы ўрад, быў супраць «Красавіцкіх тэзісаў» У.І. Леніна, называючы іх «трызненнем». Да Кастрычніцкай рэвалюцыі паставіўся адмоўна — лічыў, што па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця Расія не гатовая да сацыялістычнай рэвалюцыі. Перасцерагаў, што захоп улады «адным класам або — яшчэ таго горш — адной партыяй» можа мець сумныя наступствы. Яго пяру належаць фундаментальныя працы па філасофіі, сацыялогіі, эстэтыцы, этыцы, гісторыі рускай грамадскай думкі. Памёр у 1918 годзе.

**1920** год — 95 гадоў таму ў БССР была створана Надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменнасці, спецыяльная камісія пры Народным камісарыяце асветы БССР, якая ў 1920-1930 гг. арганізоўвала навучанне непісьменных і малапісьменных. У 1921-1922 навучальным годзе ў школах для непісьменных у рэспубліцы займаліся 12,2 тысячы чалавек. У ліквідацыі непісьменнасці актыўна ўдзельнічалі так званыя культармейцы — рабочыя, інтэлігенцыя, навучэнцы. Вялікую дапамогу камісіям аказвала створаная ў 1923 годзе грамадска-палітычная арганізацыя «Далоў непісьменнасць». У 1929 годзе ў рэспубліцы працавала каля 4 тысяч пунктаў і гурткоў па ліквідацыі непісьменнасці, у якіх займалася 75 тысяч навучэнцаў. Непісьменнасць сярод дарослага насельніцтва ў БССР у асноўным была ліквідаваная да 1932 года.

### Было сказана

**Алег ЛОЙКА, паэт, празаік, крытык:**

*«Каханне і веру не трэба ўсім выстаўляць напаказ — душу чуе толькі неба».*

## ПАЛЯВАЛІ НА БАБРА...

У мінулую нядзелю супрацоўнікі Баранавіцкай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету затрымалі трох грамадзян, якія ажыццяўлялі законнае паляванне на бабра. Але чамусьці побач з імі ляжала туша не бабра, а лася. Ні інспектары, ні міліцыянеры, якія прыбылі на месца здарэння, не паверылі ў выпадковасць стрэлу. Таму зброя і транспарт у паляўнічых-парушальнікаў былі канфіскаваны, адзін з іх накіраваны ў следчы ізалятар. Заведзена крымінальная справа.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## УСМІХНЕМСЯ

**Аб'ява.**
**«55-гадовая жанчына, маці траіх праграмістаў, просіць каго-небудзь непісьменнага навучыць яе карыстацца інтэрнэтам».**

— Дарагая, з прэзерватывам — гэта ж не здрада?

— Вядома, тады і з глушыцелем — не забойства!

**Адна дурніца калісьці захацела раўнапраўя, працаваць і насіць штаны, а ты цяпер павінна ўставаць а шостай раніцы і ісці на работу як праклятая.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4953.
Нумар падпісаны ў 19.30 10 снежня 2015 года.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |